пралетары ўсіх краін злучайцеся

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

№ 2 1932 Менск 6 сакавіка

ЦАНА АСОБНАГА НУМАРУ 5 КАП.

ОРГАН ФЭДЭРАЦЫІ АБ'ЯДНАНЬНЯЎ САВЕЦКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ І ГАЛОЎМАСТАЦТВА БССР

ТРЭЦЯЯ БАЛЬШАВІЦКАЯ ВЯСНА ПАТРАБУЕ

творчага і практычнага ўдзелу літаратуры і мастацтва

Даць творы высокай мастацкай вартасьці пра бальшавіцкую вясну

Тварам да творчага агляду комсамольскай літаратуры

Комсамол БССР разгарнуў вялікую работу па лініі актыўнага ўдзелу ў літаратурным руху. На старонках «Чырвонай зьмены» пытаньні літаратурнага руху за апошні пэрыяд знаходзяць сваё адлюстраваньне, асабліва ў сувязі з разгортваньнем творчага агляду комсамольскай літаратуры. ЦК комсамолу гэтай задачы аддае вялікую ўвагу. Аднак, няма яшчэ дастатковага пералому ў шырокіх колах савецкай літаратурнай грамадзкасьці БССР, асабліва ў шэрагах БелАПП'у—вядучай арганізацыі ў літаратурным руху—да задач комсамольскай літаратуры і да творчага агляду гэтай літаратуры.

Паміж тым зусім ясна, што найлепшым мэтодам практычнай дапамогі стварэньню комсамольскай літаратуры, стварэньню высока-мастацкіх твораў, якія адлюстроўваюць па-бальшавіцку гэроічнае змаганьне комсамолу, рабочай і працоўнай моладзі на франтох соцыялістычнага будаўніцтва—што лепшым мэтодам дапамогі гэтай справе зьяўляецца актыўны ўдзел у творчым аглядзе. Гэта задача павінна зараз стаць у асяродку ўвагі пролетарскай літаратурнай грамадзкасьці. Яна павінна быць шчыльна ўвязана з творчай дыскусіяй, што разгортваецца цяпер БелАПП'ам.

Неабходна рэзка падкрэсьліць недастатковасьць сувязі БелАПП'у з комсамолам і недастатковасьць работы ў справе задаваленьня тых запатрабаваньняў, якія ўсё больш і больш прэдяўляюцца нам з боку шматмільённага комсамолу. Сьнежаньскі пленум РАПП'у запісаў, што «апошняя літаратурная дыскусія і выступленьне комсамолу (прамова т. Косарава) зьяўляецца сьведкамі вайстраты задач перабудовы і неабходнасьці тэрміновага павароту РАПП да мэтодаў работы па-новаму. Абараняючы правільныя творчыя позыцыі, кіраўніцтва РАПП'у не зразумела, што об'ектыўным сэнсам дыскусіі зьяўляецца законнае незадаваленьне ленінскага комсамолу, таксама як і ўсёй пролетарскай грамадзкасьці тэмпамі і характарам ажыцьцяўленьня РАПП'ам указаньняў партыі пра задачы пролетарскіх пісьменьнікаў і іхных організацый. Апошняя літаратурная дыскусія, выяўляючы са ўсёй вастратой недахопы і памылкі ў рабоце РАПП'у, набыла вялікае станоўчае значэньне для пролетарскай літаратуры, яна павінна зьявіцца вырашальным штуршком для пераходу да работы па-новаму... Адным з асноўных вынікаў дыскусіі павінен быць рашучы паварот усяго РАПП'у тварам да ленінскага комсамолу і наладжваньне сапраўднай таварыскай сумеснай работы паміж комсамолам і РАПП'ам» (рэзолюцыя пленуму РАПП пра задачы перабудовы). Гэта задача зьяўляецца асноўнай ня толькі для РАПП'у, але і для БелАПП'у. Указаньні гэтай рэзолюцыі пра «ўключэньне ўсёй організацыі і ўсяго рапаўскага друку ў распачаты «Комсамольской правдой» агляд комсамольскай літаратуры, праводзеньне сумесна з комсамолам агляду работы літаратурных гурткоў»—зьяўляюцца ў той-жа ступені актуальнымі і трапяткімі для нашага літаратурнага руху, для БелАПП'у.

«Літаратура і мастацтва» ўключаецца ў агляд комсамольскай літаратуры, абвешчаны ЦК ЛКСМБ, што праводзіцца комсамолам і «Чырвонай зьменай». Неабходна ў агляд уцягнуць шырокія масы. Слова за рабочымударнікам, за літгурткоўцамі, за пролетарскімі пісьменьнікамі, за марксыцка-ленінскімі крытыкамі.

Трэба праводзіць паўсядзённую, глыбокую, энэргічную работу па творчым аглядзе з мэтамі ўмацаваньня комсамольскай літаратуры і ўзмацненьня сувязі БелАПП'у з комсамольскай організацыяй. Удзел БелАПП'у ў творчай дыскусіі, удзел усёй савецкай літаратурнай грамадзкасьці БССР у аглядзе комсамольскай літаратуры павінен мець сваім вынікам выяўленьне станоўчых і перамаганьне адмоўных бакоў, што маюць месца ў комсамольскай і юнацкай літаратуры БССР. Творчы агляд павінен пакласьці пачатак сыстэматычнай дапамогі комсамольскімі і юнацкім пісьменьнікам у справе стварэньня магутнай літаратуры, якая-б адлюстроўвала ўдзел маладых рабочых і колгасных ударнікаў у соцыялістычным будаўніцтве, якая-б зьяўляла станоўчага тыпа гэроя пяцігодкі, змагара за генэральную лінію партыі ва ўсіх галінах будаўніцтва. Агляд павінен дапамагчы перамаганьню ўсялякіх ухілаў да правага і «левага» опортунізму, да элемэнтаў павярхоўнасьці, літфронтаўскай ляўроўкі, элемэнтаў авангардызму і адрыву ад партыі і г. д.

Агляд комсамольскай літаратуры павінен ахапіць усе нацыянальныя атрады нашай пролетарскай літаратуры. Трэба адзначыць праведзеную пад кіраўніцтвам ЦК ЛКСМБ усебеларускую нараду яўрэйскіх комсамольскіх пісьменьнікаў. Гэты пачатак павінен быць замацаваны далейшай практычнай работай. БелАПП'у трэба ўключыць у агляд усе атрады літаратуры нацыянальных меншасьцяй. Гэта павінна паслужыць таксама і мэтам яшчэ большага зьяднаньня нацыянальных атрадаў пролетарскай літаратуры, мэтам узьняцьця на новую ступень інтэрнацыянальнага выхаваньня і найбольш шырокага абмену практыкай у галіне комсамольскай літаратуры.

Тварам да творчага агляду комсамольскай літаратуры!



Другі пленум ЦС ЛАЧАФ

Другі пашыраны пленум ЦС ЛАЧАФ, які скончыўся 16 лютага ў Маскве, падвёў вынікі паўтарагадовай работы Саюзнага ЛАЧАФ і намеціў шэраг конкрэтных новых задач пад кутом погляду пастаноў XVII партконфэрэнцыі, у сьвятле асноўнай політычнай задачы—пабудовы соцыялістычнага грамадзтва. У сувязі з лістом тав. Сталіна ў рэдакцыю «Пролетарская рэволюцыя» пленум пераглядзіў усю творчую продукцыю лачафаўцаў.

Пленум падкрэсьліў неабходнасьць перабудовы ўсіх літаратурных організацый у сувязі з абвастрэньнем міжнароднага становішча, ваеннай небясьпекі. Проблема абароны ў пролетарскай літаратуры, зьяўляючыся проблемай сусьветнай пролетарскай рэволюцыі, павінна стаць адной з генэральных тэм пролетарскай літаратуры.

ЛАЧАФ—ня толькі «тэматычная» організацыя, як думаюць некаторыя. ЛАЧАФ за кароткі пэрыяд здолеў стаць масавай баявой політычнай організацыяй, якая мобілізуе мастацкую літаратуру на службу абароны СССР. Саюзны ЛАЧАФ увабраў у свае шэрагі ня толькі ўдарнікаў, якія непасрэдна ідуць з радоў Чырвонае арміі і флёту, ён прыцягнуў да работы ўсю масу пролетарскіх пісьменьнікаў, прыцягвае і вядзе вялізарную работу са спадарожнікамі.

Асаблівую ўвагу пленум аддаў творчым пытаньням.

Адказны сакратар ЦС ЛАЧАФ **тав. Л. Дзегцяроў** у сваім дакладзе «Творчая справаздача ЦС ЛАЧАФ» падкрэсьліў, што да другога пленуму ЛАЧАФ мы прышлі з буйнымі творчымі дасягненьнямі. За апошні год рэгулярна выходзіць тры літаратурна політычных мастацкіх часопісаў («Локаф», «Залп», «Червони боец»), цэлы шэраг альманахаў, літаратурных старонак і г. д. на беларускай, украінскай, грузінскай, татарскай і інш. мовах. За адзін год выпушчана 61 кніжка, якія трактуюць пытаньні абароннай тэматыкі. Шэраг буйнейшых пролетарскіх савецкіх пісьменьнікаў напісалі аповесьці, апавяданьні, нарысы. З радоў Чырвонае арміі высоўваюцца новыя пісьменьнікі і крытыкі. Буйным дасягненьнем ЛАЧАФ'у зьяўляецца напісаньне раду твораў пра сучасную Чырвоную армію (Стаўскі, Малышкін, Новікаў-Прыбой, Лаўрэнеў і інш.).

Па гісторыі грамадзянскай вайны вышла некалькі дзесяткаў твораў.

Адзначыўшы рост якасьці мастацкай продукцыі, дакладчыкі, што выступалі, зьвярнулі ўвагу на канкрэтнай крытыцы недахопаў, якія ёсьць у гэтых творах. Адзначалася няправільнае вырашэньне некаторымі пісьменьнікамі проблем, што стаяць зараз перад Чырвонай арміяй. Многія творы недастаткова насычаны пролетарскай клясавасьцю. Аўтары праяўляюць недастатковае ўменьне разбройваць клясавага ворага (Рахіло—«Корабли», К. Левін—«С казбригадой на маневрах» і інш.). Пры паказе імперыялістычнай вайны ня ўсе пісьменьнікі здужваюць паказаць вайну з ленінскага пункту погляду—«ператварэньня вайны імпэрыялістычнай ў вайну грамадзянскую». Ня ўсе творы прасякнуты гэтай ленінскай ідэяй.

У вершаваных творах мала конкрэтнасьці, многа крыклівасьці, фразэолёгіі, дэклёмацыі. Яшчэ ня ўсе поэты здольваюць асобныя факты на шае рэчаіснасьці паказаць у сьвятле сусьветнае рэволюцыі.

Зараз асноўная задача творчага мэтоду—даць такія абагульненьні, такія вобразы (не абстрактныя), якія-б узрыналіся да сапраўднага рэволюцыйнага пафосу, да раскрыцьця сутнасьці ідэй; паказаць Чырвоную армію ў неадрыўнасьці з тымі працэсамі, якія зараз адбываюцца ў краіне.

Ёсьць небясьпека ў тым, што ў нас якасьць твораў пра Чырвоную армію ня дасьць высокая, хоць колькасьць іх і вялікая. Пленум адзначыў, што да гэтага часу ў буйных мастацкіх творах бадай што не закрануты такія важнейшыя проблемы, як засваеньне вайсковай тэхнікай у Чырвонай арміі, паказ палявога камандзіра, мала твораў, якія-б закраналі інтэрнацыянальную сутнасьць Чырвонай арміі, якія-б разбройвалі падрыхтоўку імперыялістаў, соцыял-фашыстаў і прочых—як перадавога атраду контррэволюцыі да новых войнаў.

Пленум падкрэсьліў неабходнасьць вывучэньня марксызму-ленінізму. У галіне гісторыі грамадзянскай вайны пленум паказвае на неабходнасьць разглядаць грамадзянскую вайну, як зьвяно сусьветнай пролетарскай рэволюцыі, як вайну супроць сусьветнага імпэрыялізму.

Самым слабым зьвяном у рабоце ЛАЧАФ'у зьяўляецца крытыка. Яна толькі пачынае разьвівацца. Лачафаўская крытыка яшчэ зусім не закранула клясычныя буржуазныя творы пра вайну з пункту погляду дыялектычнага матэрыялізму,

Таксама шмат увагі было аддадзе на творчасьці ўдарнікаў чырвонаармейцаў, закліканых у літаратуру. Пленум адзначыў вялікі колькасны рост літаратурных гурткоў, павароту іх да баявой і творчай вучобы (выпушчана некалькі сотняў літаратурных старонак). Для творчасьці ўдарнікаў характэрна клясавая завостранасьць твораў; але разам з тым мастацкая вышыня твораў не заўсёды такая, якую мы патрабуем.

Вельмі важным для другога пленуму зьяўляецца тое, што шэсьць буйнейшых профсаюзаў і газэта «Гудок» прынялі шэфства над ЛАЧАФ, абавязаўшыся дапамагаць ў рабоце ЛАЧАФ, прапагандаваць вайсковую літаратуру сярод членаў профсаюзаў. Пленум паклаў пачатак сувязі з комсамолам, абавязаўшыся ў літаратуры асьвятляць ўдзел комсамолу ў абароне СССР.

Усе гэтыя новыя задачы накладаюць на ЛАЧАФ, як баявую літартурную організацыю, вялікую адказнасьць у справе ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны. Гэта у большай ступені, чым да другой організацыі, адносіцца да беларускага ЛАЧАФ'у, бо Савецкая Беларусь, зьяўляючыся фарпостам Савецкага Саюзу, у будучай вайне павінна прыняць першы ўдар. БелЛАЧАФ, які ў апошні час пачаў разгортваць работу, павінен сваім мастацкім словам, моцнай зброяй, дапамагаць ўзмацненьню Чырвонай арміі, узброенаму атраду пролетарскай дыктатуры. Чырвоная армія, якой належыць колёсальная роля ў справе ўзмацненьня краіны—бацькаўшчыны пролетарыяту ўсяго сьвету—павінна ўзмацняцца.

В. К.

ДЭЛЕГАТЫ ПЛЕНУМЕ ЦС ЛАЧАФ



Задачы фронту літаратуры і мастацтва ў веснавой пасеўнай кампаніі

ЦК КП(б)Б і СНК БССР высунулі перад усімі організацыямі разгорнутую бальшавіцкую програму работы ў сувязі з падрыхтоўкай і правядзеньнем бальшавіцкай вясны. Баявой задачай зьяўляецца—забясьпечыць пасеў 2. 850.000 га яравога кліну, узьняць ураджайнасьць збожавых культур на 12 проц., тэхнічных—на 1. проц., і бульбы—на 20 проц. Авалодаць агротэхнікай і зоотэхнікай, падрыхтаваць кадры і г. д.

Пасьпяховае выкананьне задач, пастаўленых партыяй, цалкам залежыць ад правільнага ажыцьцяўленьня чарговых задач па організацыйна-гаспадарчым замацаваньні колгасаў, якія вызначаны ў пастанове ЦК УсеКП(б). Асноўным зьвяном у правядзеньні мерапрыемстваў па організацыйна-гаспадарчым умацаваньні колгасаў, у іх сучаснай арцельнай стадыі разьвіцьця, перш за ўсё зьяўляецца колгасная брыгада. Здолець правільна організаваць брыгаду, падабраць моцных брыгадзіраў, організаваць работу брыгады на пэўным вучастку, спаборніцтва паміж брыгадамі па важнейшых вытворчых паказальніках—асноўная задача.

Задачы фронту літаратуры і мастацтва у падрыхтоўцы і правядзеньні трэцяй бальшавіцкай вясны зьяўляюцца надзвычайна адказнымі і цалкам вынікаюць з тых задач, якія пастаўлены партыяй перад пасеўнай кампаніі.

Вядучы змаганьне за бальшавіцкую сяўбу, мы павінны ўсімі сродкамі мастацтва паказаць, як «извечная вражда мелких собственников уступает место коллективному труду колхозников, которые становятся сознательными строителями социализма».

Конкрэтнымі задачамі пісьменьніцкіх організацый зьяўляецца неадкладнае **накіраваньне брыгад непасрэдна у колгасы і саўгасы** для напісаньня мастацкіх твораў, якія адлюстроўваюць барацьбу колгасьнікаў за бальшавіцкія тэмпы выкананьня плянаў трэцяй бальшавіцкай вясны, паказваючы гэрояў комуністычнай працы, лепшых брыгадзіраў, лепшых партыйных кіраўнікоў сяўбы, якія сваёй працай дапамагаюць наносіць руйнавальны ўдар па кулацтву і яго агентуры у шэрагах партыі.

Пісьменьнікі павінны ўключыцца у масавую політасьветную работу сярод колгасьнікаў і індывідуальнікаў, якая праводзіцца мясцовымі організацыямі, наладжваючы мастацкую чытку твораў, прысьвечаных організацыйна-гаспадарчаму замацаваньню колгасаў і вясновай сяўбе.

Тэатры, трамы, студыі, мастацкія навучальныя ўстановы павінны тэрмінова вылучыць брыгады, якім неабходна падрыхтаваць пасеўна-колгасны рэпэртуар для выкананьня яго непасрэдна ў колгасах, саўгасах, нардомах і хатах-чытальнях. Профсаюзныя організацыі працаўнікоў мастацтва павінны разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую брыгаду па ўдзелу ў веснавой пасеўнай кампаніі. Актыўны ўдзел працаўнікоў мастацтва ў змаганьні за бальшавіцкую сяўбу—гэта азначае таксама і змаганьне за бальшавіцкую партыйнасьць у мастацтве.

Кінематографія БССР павінна мобілізаваць усе кінопрасоўкі, найлепшыя ігравыя, тэхнічныя і агітацыйныя фільмы і накіраваць іх непасрэдна на вёску, організаваўшы масавую дэмонстрацыю фільм, дапамагаючы змаганьню за плян трэцяй бальшавіцкай вясны. Кожны кіноработнік і пасьветработнік кіно павінен усьвядоміць вялізарную політычную адказнасьць, якая высоўваецца перад імі партыяй і пролетарскай грамадзкасьцю у сувязі з пасеўнай кампаніяй.

Мастакі, таварыства фото павінны накіраваць свае лепшыя сілы ў колгасы і саўгасы для ўдзелу сродкамі свайго мастацтва у змаганьні за бальшавіцкую сяўбу.

Асабліва адказныя задачы пасеўная кампанія ставіць перад арміяй самадзейнага мастацтва. У БССР ёсьць каля 900 самадзейных гурткоў з 20 тыс. удзельнікаў рабочых і колгасьнікаў.

Задача самадзейнага мастацтва—зараз жа ўключыцца ў работу ў пасяўной кампаніі. У гэтай справе перад пісьменьнікамі, у прыватнасьці перад драмгурткамі, перад композытарамі паўстае задача—**даць самадзейнаму мастацтву рэпэртуар на тэмы організацыйна-гаспадарчага замацаваньня колгасаў і змаганьня за бальшавіцкую сяўбу.**

У сваю чаргу самадзейныя гурткі павінны свае паказы, концэрты пераносьці непасрэдна ў колгасы, саўгасы і хаты чытальні.

Кожны гарадзкі самадзейны гурток павінен пабываць у колгасе ў часе падрыхтоўкі да сяўбы.

Профсаюзы павінны шырока разгарнуць спаборніцтва паміж самадзейнымі гурткамі на лепшы ўдзел у правядзеньні гэтай работы.

Програма трэцяй бальшавіцкай вясны, дадзеная нашай партыяй, зьяўляецца зусім рэальнай наперакор опортуністычным разважаньням прыхільнікаў тэорыі самацёку. **Актыўным удзелам усяго фронту літаратуры і мастацтва пад кіраўніцтвам КП(б)Б, супольна з усёй пролетарскай грамадзкасьцю гэта програма будзе выканана і перавыканана.**

М. МОДЭЛЬ.

Протэст савецкіх пісьменьнікаў БССР супроць пакараньня сьмерцю васьмі алабанскіх нэграў

Заслухаўшы паведамленьне пра зацьверджаньне прысуду на пакараньне сьмерцю васьмі алабанскіх вязьняў—маладых нэграў—агульны сход пролетарскіх і савецкіх пісьменьнікаў Менску разам з рабочымі-ўдарнікамі, заклікаными ў літаратуру, рашуча протэстуе супроць выкананьня прысуду над ні ў чым нявіннымі нэгрыцянскімі маладымі рабочымі. Гэтым прысудам амэрыканская буржуазія яшчэ раз яскрава паказвае пролетарыяту ўсіх краін, што яна агнём і крывёю прыціскае ўсякую праяву рэволюцыйнае вольнае думкі, што яна агнём і крывёю прыгнятае працоўных нацыянальнасьцяй, якія ўзьнялі сьцяг вызваленьня. Амэрыканская буржуазія распальваньнем расавай, нацыянальнай нянавісьці імкнецца пашкодзіць аб'яднаньню сіл пролетарыяту розных нацыянальнасьцяй, якія ў злучнай барацьбе нанясуць апошні ўдар па барацьбе нанясуць апошні ўдар па буржуазіі.

Беларускія пролетарскія і савецкія пісьменьнікі заклікаюць усіх рабочых і колгасьнікаў, усе навукова-культурныя і пісьменьніцкія організацыі протэставаць супроць дзікага разгулу амэрыканскіх фашысцкіх банд.

ПРЭЗЫДЫУМ СХОДУ:

М. ЛЫНЬКОЎ, П. ГАЛАВАЧ, А. АЛЕКСАНДРОВІЧ, П. ШВЭЙДЭЛЬ, Л. БЭНДЭ, С. НОРТМАН, Х. ДУНЕЦ, БЛОШТЭЙН.

ПЯТРУСЬ БРОЎКА

Загадаем вясьне...



Чуеце,
крочыць дарогай
яна
і капяжы
задымілі бясконца..
Выходзіць на сцэну
наша вясна
з поўнымі жменямі
цёплага сонца.
Гаворыць
набраклай зямле—
прымай!..
Гадуй,
даглядай ты свой
ураджай,
каб вырасла зерне
ў добры пуд!
І мы загадаем
ў першы салют:—
пайсьці трактарам
калаціць зямлю:
І мы загадаем
ў другі салют:—
сявярням сваім
сямяніць зямлю;
І мы загадаем
ў трэці салют:—
усім даглядаць
і любіць зямлю!
І нашае слова
да ўсіх цяпер:—
усе трактары
перагледзь,
правер!
Каб на палі
выходзіў колгас
суладна
і дружна
і ў пэўны час.
І мы патрабуем
у гэты год—
загадзя скончыць
увесь рамонт,
каня даглядаць
і так любіць,
каб сілу яго
скарыстаць зямлі.
Каб лепш узьнялося—
магло расьці,
кожнае зерне
праз трыер пусьціць!
І мы загадаем
тады вясьне:—
горда паводкамі песеньзьвінець,
у рупнай рабоце
прысьці ў колгас—
лістамі гамонку
вясьці пра нас,
каб рос,
разрастаўся
вясновы дзень—
багатаю руньню
нашых ідэй...
Каб тлеў да астатку
і ў дзень і ў ноч—
апошні варожы
корч.
Дык чуеце,
крочыць дарогай
яна,
зямля ўзьнімаецца
ў буйнай гамонцы:—
Выходзіць на сцэну
наша вясна
з поўнымі жменямі
цёплага сонца.

Менск—1932 г.

Дастойна сустрэнем вялікую гадавіну

Чым мы павінны сустрэць 15-ю гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі?

— Мы—пісьменьнікі, поэты, мастакі, працаўнікі тэатральнага фронту, працаўнікі кіно, працаўнікі вялікага фронту савецкага мастацтва?

Сутнасьць самой гадавіны, яе вялізарнае гістарычнае значэньне як для працоўных усяго Савецкага Саюзу, так і для працоўных мас усяго сьвету дае вычарпальны адказ на пастаўленае пытаньне.

15-я гадавіна падагуліць пройдзены пролетарскай дзяржавай шлях, параўнальна невялікі па часу, па гадох, і ў той-жа час выключна грандыёзны па сваіх конкрэтных выніках, па сваіх дасягненьнях. Гэтая грандыёзнасьць, гэтая веліч ня мае сабе прэтэндэнтаў у мінулай гісторыі сьвету, як па тэмпах, так і асабліва—і гэта галоўнае—па якасьці пройдзенага шляху, па якасьці нашых вынікаў і здабыткаў.

Кастрычніцкая рэволюцыя крута павярнула былую рабскую, някультурную, адсталую краіну да рашучага змаганьня за соцыялізм і ў гэтым змаганьні краіна выходзіць пераможцай. У гэтым змаганьні, які абумовіў вялізарныя зьмены ў экономіцы краіны, у яе культурным будаўніцтве, у псыхіцы шматмільённых працоўных мас, краіна заняла перадавое месца ў сьвеце, зрабілася першай пролетарскай дзяржавай, на якую з вялікай надзеяй глядзяць працоўныя ўсіх краін, як на цытадэль **сусьветнай пролетарскай рэволюцыі.**

Гэтая сутнасьць 15-й гадавіны пролетарскай рэволюцыі з выразнай акрэсьленасьцю вызначае нашы задачы, задачы савецкай літаратуры, савецкага мастацтва.

Паказаць пройдзены шлях, стварыць манумэнты мастацтва, якія зьяўляючыся высокапраўдзівымі дакумантамі эпохі, у той-жа час усімі ўласьцівымі мастацтву сродкамі дапамагалі комуністычнай партыі ў справе далейшай мобілізацыі мас на новыя посьпехі і перазагі, у справе выхаваньня гэтых мас у комуністычным напрамку, у справе перапрацоўкі старога чалавечага матэрыялу ў сапраўдных змагароў, энтузіястаў соцыялістычнага будаўніцтва.

У нашай літаратуры мы маем пасобныя творы, якія так ці інакш закранаюць пытаньне Кастрычніцкай рэволюцыі. Уся наша літаратура ў асноўным працуе над матэрыяламі, якія зьявіліся ў выніку пролетарскай рэволюцыі. Уся савецкая літаратура, і пролетарская ў першую чаргу, зьяўляюцца самі па сабе непасрэдным вынікам гэтай рэволюцыі. Але-ж да гэтага часу мы ня маем яшчэ ніводнага раману, ніводнай аповесьці, альбо поэмы, якія-б паказалі нам Кастрычнік ва ўсёй яго велічы, якія поўнасьцю ўскрылі ўсю глыбіню, усё значэньне пролетарскае рэволюцыі, якія-б далі нам сапраўды мастацка-дзейны паказ шляхоў бальшавіцкай рэволюцыі, якія-б далі нам глыбокі **марксыцка-ленінскі аналіз зьяў, падзей, усіх тых** разнастайных працэсаў, якія адбываліся з часу рэволюцыі па нашыя дні. Гэтыя творы павінны паказаць нам за ўсёй велічы роўнае значэньне пролетарыяту і яго авангарду комуністычнай партыі ў справе соцыялістычнай перарсбкі нашай краіны.

Даць такія монумэнтальныя творы, якія-б падагульвалі шлях Кастрычніцкіх перамог, шлях барацьбы пролетарыяту за Кастрычніцкія заваёвы—неадкладная задача савецкай літаратуры і ўсіх галін нашага мастацтва.

Некаторыя нашыя пісьменьнікі спрабуюць даць нам такія творы, некаторыя пішуць ужо гэтыя творы, якія павінны падагуліць пройдзены этап пролетарскай рэволюцыі. Але-ж гэтага мала, гэта адзінкавыя выключэньні, гэта работа саматужнага парадку. У справе стварэньня фундамантальных мастацкіх твораў, прысьвечаных 15-й гадавіне Кастрычніка, павінны быць уцягнуты ўсе сілы літаратурных організацый, усе атрады нашага ідэолёгічнага фронту, бо толькі агульнымі колектыўнымі дамаганьнямі можна дабіцца пасьпяховага выкананьня пастаўленай перад намі задачай.

Тут не павінна быць самацёку, бязплянавасьці. Пролетарская грамадзкасьць мае поўнае права патрабаваць ад нас, каб мы да гэтай конкрэтнай справы прыцягнулі лепшыя мастацкія сілы нашай краіны і стварылі для іх творчай работы самыя найлепшыя ўмовы і абставіны.

Якія конкрэтныя запатрабаваньні мы можам прад'явіць нашым тэорэтычным сілам, фронту нашай марксыцка-ленінскай крытыцы, цэнтру нашай літаратуразнаўчай работы—інстытуту літаратуры і мастацтва пры Беларускай Акадэміі Навук, тым шматлікім асьпіранцкім кадрам, якія групуюцца **вакол гэтага інстытуту?** Да цяперашняга часу ў нас няма вычарпальных матэрыялаў пра разьвіцьцё беларускай савецкай літаратуры, пра разьвіцьцё масавага пролетарскага літаратурнага руху—беларускага і нацыянальных меншасьцяй, пра разьвіцьцё беларускага мастацтва.

Да гэтага часу мы ня маем дакладных дыфэрэнцыяваных програм для нашых масавых літгурткоў на фабрыках і заводах. Мы ня маем ніводнае популярнае кніжкі альбо брошуры пра самыя элемэнтарныя асновы мастацкага слова, кніжкі, якая была-б першым дапаможнікам пачынаючага пісьменьніка з рабочых-ударнікаў па тэорэтычнай і творчай вучобы. Мы ня маем ніводнае популярнае кніжкі для нашага масавага чытача пра сутнасьць нашай літаратуры, сутнасьці і задачы пролетарскага літаратурнага руху, сутнасьці розных плыняў у літаратуры, сутнасьці тых шматлікіх шкодных тэорый і «тэорыек» на літаратурным і мастацкім фронце, з якімі праводзілася і праводзіцца зараз жорсткае змаганьне (пераверзеўшчына, дэборыншчына, літфронтаўшчына).

Гэтыя кніжкі, гэтыя матэрыялы павінны быць дадзены нашымі крытыкамі, нашымі літаратуразнаўцамі.

Важнейшыя задачы стаяць перад масавым пролетарскім літартурным рухам. Гэты рух павінен быць узьняты на новую вышэйшую ступень. Заклік рабочых ударнікаў у літаратуру, даўшы нам значныя вынікі ў змаганьні за гегемонію пролетарскай літаратуры, на сёньняшні дзень, на вялікі жаль, яшчэ не замацаваны. Мы маем вялікія зрывы ў гэтай рабоце, па некаторых гарадох заклік ударнікаў у **літаратуру наогул яшчэ не разгорт**ваўся як сьлед, у самым Менску мы за апошнія часы маем некаторыя зьніжэньні тэмпаў у гэтай рабоце. Адсюль перад намі паўстаюць неадкладныя задачы замацаваньня наяўных посьпехаў, забясьпечаньня далейшага росту гэтага руху як ушыркі, так і асабліва ў глыбіню, у бок якаснага паляпшэньня ўсёй работы з ударнікамі-рабочымі, заклікаными ў літаратуру, у бок налажваньня сталай выхаваўчай работы з імі, сыстэматычнай высока-якаснай, творчай учобай. Для падагульваньня гэтай работы трэба правесьці спаборніцтва паміж нашымі асоцыяцыямі, таксама разгарнуць шырокі конкурс—спаборніцтва паміж літаратурнымі гурткамі на годнасьць гуртка іменавацца «імем 15-й гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі».

У нашай газэце трэба будзе прарэсьці сталы агляд усёй мастацкай літаратуры пра Кастрычнік, літаратуры, якая зьявілася ў апошнія гады, пад кутом погляду ліста тав. Сталіна.

Перад газэтай «Літаратура і Мастацтва» ставіцца задача асьвятленьня ўсёй тэй падрыхтоўчай работы да гадавіны, работы, якая праводзіцца літаратурнымі організацыямі, тэатрам, кіно, выяўленчым мастацтвам, працаўнікамі пролетарскай музыкі, эстрады і г. д. І ня толькі асьвятленьня, але і організацыі гэтай работы, наданьне ёй патрэбнага строга-вызначанага напрамку.

Мы вызначылі толькі асноўныя адпраўныя пункты ў справе падрыхтоўкі да вялікай гадавіны. Галоўная задача—своячасова ўзяцца за гэтую падрыхтоўку з тым, каб дастойна сустрэць, дастойна азнаменаваць выдатнейшую **гадавіну пролетарскай рэволюцыі.**

Міхась ЛЫНЬКОЎ.

12 сакавіка рэдакцыя газэты „Літаратура і мастацтва“ склікае нараду

работнікаў літаратуры і мастацтва аб веснавой сяўбе

Нарада адбудзецца ў Доме пісьменьніка, а 7 гадз. увечары

Творчы агляд маладзежнай літаратуры

Дадзім мастацкі паказ гэроічнага змаганьня комсамолу

на фронце социялістычнай прамысловасьці, на фронце социялістычных палёў

Ул. Сядура

Комсамол у беларускай поэзіі

Паказ комсамолу ў беларускай поэзіі амаль выключна прыпадае на поэзію белапапаўскую. Большасьць твораў пра комсамол прыпадае на пэрыяд аднаўленчы. Тут мы маем такія творы, як «Юны змаганец» і «Астрожнік» Паўлюка Труса, «Комсамолія» Міхася Чарота, «Комсомол» Андрэя Александровіча, «Райком» і інш. вершы Ю. Таўбіна.

Гэтыя творы пісаны тады, калі ўжо адгрымелі буры грамадзянскае вайны і краіна ўступіла ў паласу аднаўленьня разбуранае гаспадаркі. Галоўны мотыў гэтых твораў—роля і энтузіязм комсомолу на франтох будаўніцтва новага жыцьця. Грамадзянская вайна тут выступае як успамін гэроічнага мінулага, як напаміны пра той гэроізм, які быў стымулам перамог комсамолу, моладзі на франтох грамадзянскае вайны. Гэты гэроізм, энтузіязм выступае тут не як самамэтны гэроізм «бязвусых энтузіястаў», а як гэроізм мэтавы, усьвядомлены ў разрэзе соцыялістычных ідэалаў пролетарыяту.

Паўлюк Трус першы даў мастацкія вобразы гэроічнага, адданага змаганьня моладзі, комсамолу на франтох грамадзянскай вайны.

У поэме «Юны змаганец» ён падае вобраз адважнага юнака, партызана Янкі, і яго брата, «атамана паўстанцаў», комсамольца Міхася, якія вядуць гэроічнае змаганьне з «белапольскімі бандытамі пазнанцаў». У поэме пададзены моманты далучэньня маладых паўстанцаў да чырвоных атрадаў і сумеснага пераможнага змаганьня супроць агульнага ворага. Поэма канчаецца ўздымнымі радкамі пра «юнага змаганца»:

«Сёньня ён ды нястрымана—вольны
Піонэр і паўстанец у вёсцы,
Дзе нядаўна ў часы паднявольля
Гадаваўся ў пакутах і рос.
Яго брат, што старое разбурыў,—
Комсомол з пролетарскаю верай...
Яму матка—ўзгадована бурай
Комсомолія БССР».

У «Астрожніку» П. Трус дае вобраз паўстанца юнака «комсомольца Якіма», які адважна сустракае кару расстрэлам з рук ворагаў, бо тая справа, за якую ён змагаўся, ён верыць, не памрэ, а будзе даведзена працоўнымі да канца:

«Ён памёр... Расстралялі Якіма...
Цёмны бор зашумеў галасьней...
Але справа магутнага КІМ'а
Не памрэ,—будзе вечна квітнець».

Міхась Чарот у поэме «Комсомолія» дае сынтэзаваны вобраз комсамолу часоў грамадзянскае вайны і аднаўленчага пэрыоду.

Міхась Чарот адлюстроўвае баявыя ўздымныя настроі, якія валодалі комсамоліяй пасьля пераможнага канца грамадзянскае вайны ў пачатку аднаўленчага пэрыоду, калі яшчэ былі ж... вельмі сьвежымі былі непасрэдныя ўражаньні ад гэроічных боек. «Комсамолія» Чарота мае заведамі романтызаваны характар, калі яснае ўсьведамленьне далейшых і чарговых задач падмяняецца агульнай романтычна-ўзьнятай патэтыкай:

І расьце, і расьце, і мужае
Комсамольцаў адважная раць!
Што ім вораг? Што і мяжа ім,
Як захочуць яны пагуляць»!

Таму ў палоне гэтага ўздыму часамі і ў «Комсамоліі» зьнікае і губляецца конкрэтны рэальны малюнак змаганьня, далейшых задач. Таму і рэчаіснасьць прымае нейкі падсалоджаны выгляд, зьнікае складанасьць, супярэчнасьці, цяжкасьці змаганьня.

«Ня жыцьцё—а раздольле...
Бо дзеці паўстаўшых краін...
«Беларусь і ты, Комсамолія».

Але Чаротава «Комсамолія» ў той час зьявілася першым гучным мастацкім водгукам беларускай поэзіі на комсамольскую тэматыку.

У адносінах перамаганьня гэтай романтычнай ідэалізацыі, перамаганьня агульнай патэтыкі далей пайшоў Андрэй Александровіч. У невялічкай поэме «Комсамол» (1925 г.) Александровіч падае комсамол на фронце той будаўнічай працы, у якую комсамол акунуўся адразу пасьля грамадзянскай вайны. (Праўда, апошнюю поэт у той час успрыймае, як «мяцежную стыхію», а не як кіруемы партыяй процэс). Александровіч пайшоў па шляху паказу творчых будняў комсамолу, штодзеннае яго работы па адбудоўваньні разбуранай гаспадаркі.

Зноў запулі на заводах машыны.
Новае ёсьць, ня стала руінаў.
І ў гэтай працы дні і ночы
Комсамол—чорнарабочы.

Тэндэнцыі паказу комсамолу не ў абстрактна-патэтычных рысах, а ў творчай практыцы—гэта дадатны бок Александровічавага «Комсамолу».

«Комсамол у фабзаўкоме.
Комсамол—у сельсавеце».

Але ўсё-ж такі ўся складанасьць, багацьце і конкрэтнасьць працы і жыцьця комсамолу аднаўленчага пэрыоду не знайшлі свайго шырокага выяўленьня ў Александровіча. Усё гэта толькі асобныя рысы, схэматычна пададзеныя, асобныя кавалкі, паміж сабой мэханічна зьвязаныя. Тут яшчэ няма суцэльнага вобразу комсамолу ва ўсёй яго складанасьці і адзінстве.

Але ня толькі гэтым вершам «Комсамол» Александровіч аддаў даніну комсамольскай тэматыцы. Трэба адзначыць, што шэраг іншых вершаў поэта, калі ён непасрэдна і не адлюстроўвае комсамолу, не бярэ яго сваім об'ектам, па сваёй накіраванасьці тым ня менш зьяўляецца вельмі сугучным комсамолу і пролетарскай моладзі наогул. У апошні час Александровіч напісаў вялікую вершаваную п'есу «Напор», якая зьяўляецца першым буйным поэтычным творам беларускай пролетарскай літаратуры пра комсамол.

Пэўную даніну комсамольскай тэматыцы аддаў і Пятрусь Броўка.

У «Слове ў комсамольскіх спрэчках» (вершаваная прамова на X зьезьдзе ЛКСМБ, 10 студзеня 1931 г.) Броўка піша пра комсамол у рэконструкцыйны пэрыод, пра актыўны ўдзел комсамолу на ўсіх франтох соцыялістычнага будаўніцтва, пра змаганьне комсамолу **за выкананьне пяцігодкі.**

Баявы, заклікаючы настрой «Слова ў комсамольскіх спрэчках»—гэта асноўны ягоны дадатны бок. Але гэтага мала. Апульшчына, адсутнасьць конкрэтна-вобразнага паказу ролі комсамолу ў соцыялістычным будаўніцтве, схэматызм—зьяўляецца недахопамі і Броўкі.

Няма ў ягонай творчасьці жывых вобразаў комсамольцаў. Няма глыбокага, усебаковага, конкрэтнага (ва ўсёй складанасьці і супярэчнасьцях) паказу вобразу комсамольца, які змагаецца за пабудову соцыялізму. Гэта азначыць, няма таго асноўнага, што патрабуецца ад комсамольскай літаратуры.

Некаторую ўвагу комсамольскаў тэматыцы аддаў і Юлі Таўбін («Райком» і інш.).

Але ягоны «Райком» не пазбаўлены інтэлігенцкіны ў горшым разуменьні гэтага слова. Яна перш за ўсё адчуваецца ў нейкай як-бы дыстанцыі, на адлегласьці якой поэт «восхищается» райкомам. Адчуваецца пэўны імпрэсыянізм. «Райком» носіць характар занатоўкі ўражаньняў, малюнкаў, які поэт меў магчымасьць назіраць. І ўжо ў гэтым спадарожніцкае крэдо «Райкому».

Замест паказу кіруючай ролі партыі, волю якое і выконвае комсамол і ўся пролетарская моладзь, Таўбін надзяляе моладзь авангардысцкай роляй, надае ёй ролю траха што ні кіраўніка будаўніцтвам соцыялізму, змазваючы ролю партыі:

«Мы—моладзь. Моладзь—гэта ўсё.
Мы—моладзь. Будучнасьць за намі...
... Мы—аднаўлёныя стагодзьдзі,
Мы ўперад на стагодзьдзі бачым»...
і г. д.

„Сюсюканьне“ на адрас комсамолу

Калі некаторыя блізкія да пролетарскай літаратуры спадарожнікі маглі даць больш-менш карысныя комсамолу творы, дык іншы характар носяць заляцаньні да комсамолу поэтаў накшталт В. Маракова і Т. Кляшторнага, спадарожнікаў, якія і на сёньнешні дзень, праўда, не ў аднолькавай ступені, яшчэ ня здолелі належным чынам перабудаваць сваю творчасьць у адпаведнасьці з патрабаваньнямі рэконструкцыйнага пэрыоду. Комсамолу ў творчасьці гэтых поэтаў адведзена месца, вядома, меншае ва ўсё. Рэконструкцыйны пэрыод, выклікаўшы ў іхняй творчасьці пэўныя зрухі ў бок набліжэньня да сучаснасьці, выклікаў адначасова і тэндэнцыю павароту да комсамолу. І замест таго, каб падыйсьці да комсамолу, да справы паказу комсамолу ў мастацкай літаратуры (поэзіі) сур'ёзна, глыбока і на аснове ўсебаковага вывучэньня і азнаямленьня з жыцьцём комсамолу, на аснове пранікненьня ў тое, чым жыве сёньня комсамол, даць высокамастацкія, каштоўныя творы пра комсамол,—яны адбаярваюцца, як кажуць, алтыскамі, сюсюканьнем на адрас комсамолу.

В. Маракоў піша верш «Комсамолу Мазыршчыны» (1929 г.). Поэта зацікавіў Мазырскі комсамол не на фронце соцыялістычнага будаўніцтва, не яго вобраз ў штодзеннай, творчай, будаўнічай працы, а са сцэны аднаго з клюбаў Мазыру, дзе поэт выступіў з чыткаю вершаў. І адгэтуль, са сцэны, з вышыні «своего величия» поэт робіць рэвэрансы ў бок комсамолу:

... Вітаньне
Вам, сыны новай стараны...
... О, я таксама з новаю культурай
Іду адною з вамі паласой,
Каб несьці сьцяг змаганьня,
Перамогі,
Гарэць (!?) імкненьнем юных і
жывых...
... Які ўздым!
Як сэрца б'е трывогу!
Як ўзьнята ружа (!) гордай (!?)
галавы!..

(«Верш. жад.», ст. 21—22).

А вось чытайце салодзенькія рэвэрансы ў бок комсамолу Т. Кляшторнага:

Наш комсамол сягоньня на чале (!?)
Вялікага сусьветнага імкненьня...
Вось, сапраўды, дзе моцны чалавек,
А не абстракцыя,
Не лятуценьні... і г. д.

Тут ужо сюсюканьне проста пераходзіць у троцкісцкі авангардызм (комсамол, а не партыя «на чале (!) сусьветнага імкненьня»).

Комсамолу Беларусі патрэбны сапраўдныя поэтычныя творы, якія адлюстроўвалі-б гэроічнае змаганьне комсамолу ў высокамастацкіх вобразах, а не рэвэрансы на адрас комсамолу. Для гэтага патрэбны максымум увагі да комсамолу ня толькі з боку пролетарскіх пісьменьнікаў, але і з боку спадарожнікаў.

Супроць халтуры

Небясьпека халтуры набывае асабліва востры характар і па лініі комсамольскай тэматыкі. Клясавы вораг намагаецца скарыстаць гэты фронт для сваіх клясавых, варожых нам інтарэсаў. На змаганьне з халтурай у комсамольскай тэматыцы зараз павінна быць зьвернута асаблівая ўвага.

Пра «Комсамольскія вершы» Юркі Лявоннага пісалі ўжо і гаварылі шмат. Усе выказваньні сыходзіліся на ацэнцы гэтага зборніку, як зборніку халтурнага. Таму зараз спыняцца на ім ня прыходзіцца. Нясучы назву «Комсамольскіх вершаў» і гэтым самым прэтэндуючы на паказ комсамолу, зборнік Лявоннага ўяўляе сабою па сутнасьці паклёп на комсамол. Комсамол паўстае ў ім праз абывательскамяшчанскае шкелца.

Такі-ж характар носіць поэма «Ліпнёвая радасьць» Паўлюка Ананьнева, зьмешчаная ў III зборніку віцебскай філіі БелАПП «Рытмы будаваньня», які вышаў у 1931 г.

Аўтар гэтага халтурнага твору (гэрой «поэмы» называе сябе прозьвішчам аўтара—Ананьневым) успамінае, як ён калісьці аднойчы сустрэў нейкую вясковую дзеўчыну. На фоне сантымэнтальна-падсалоджанай прыроды гэрой назязвае роман. Ён, называючы сябе комсамольцам, у поэме на кожным кроку клянецца комсамолам і часта гаворыць ад яго імя. І вось гэты «комсамолец», а на самой справе выразны мешчанчук, расказвае чытачу свае кахальныя прыгоды, смакуючы на ўсякія лады сэксуальны бок гэтых прыгодаў. З усімі падрабязнасьцямі ён апавядае, як у забыцьці каханьня «ён аддаў і юнацтва і сэрца», як ён «зьпіў каханьне».

Расьпісаўшы, як належыць, сваё мяшчанскае каханьне, аўтар далей расказвае, як ягоны об'ект кахальных прыгод з вёскі выяжджае на вучобу ў Ленінград. Гэрой ўпадае ў сумоту, пэсымізм. Каб знайсьці выйсьце з свайго пэсымістычнага становішча, ён едзе на рабфак. Але сумота па каханцы і тут не дае спакою нешчасьліўцу. І на некалькіх старонках аўтар расьпісвае сумныя настроі гэроя. Каханка з Ленінграду яго суцяшае лістамі мяшчанскага зьместу.

Яе абяцаньні «зноў прыгарнуць да грудзей» крыху суцішае сум нашага «гэроя» і ён у парыве пад'ёму робіць рэвэрансы ў бок новае вёскі, комсамолу, сучаснага.

Побач з мяшчанскай пашлясьцяй, прыкрываючыся густа ўсыпанай на кожнай старонцы рэволюцыйнай фразэолёгіяй, праводзіцца яўна рэакцыйныя ідэйкі. Пад шыльдаю паказу новага ў вёсцы, пад вэлюмам халтурных дыфэрамбаў на адрас комсамолу, у поэме «Ліпнёвая радасьць» Ананьнеў, хоча ён таго ці ня хоча, праводзіць яўна кулацкія тэндэнцыі паклёпу на пролетарскі горад, тэндэнцыі супроцьстаўленьня яму вёскі. Справа ў наступным.

Гэроіня поэмы Марыся (каханка «гэроя») у пролетарскім цэнтры Ленінградзе нічога акрамя богэмы ня ўбачыла. Пролетарскі горад застаўся па-за яе ўвагаю. Падаючы вобраз Марысі ў пачатку поэмы, як вобраз ідэальнай, «чыстай» сялянкі, аўтар далей праводзіць кулацкую ідэйку, што горад сапсаваў яе, скалечыў. Увогуле, нешта накшталт Дудароўвага «Вятру з усходу», дзе горад падаецца, як носьбіт усяго адмоўнага, у якім вясковы хлапец, прыехаўшы на вучобу, трапляе ў богэмскае асяродзьдзе, разлагаецца. Гэтак і Марыся, паехаўшы ў Ленінград на вучобу, знайшла там толькі богэму, у якой губляе ўвесь свой мінулы вясковы вобл'ік; богэма, уцягнуўшы ў сваё логава, калечыць яе. Праілюструем урыўкам з яе лісту да вядомага нам «гэроя»:

Дзе, ты, дзе, каханы той, далёкі?
Мо' ўжо на прызьбе шэрых хат?
Я цяпер за буслаў стук і клёкат
Аддала-б адразу Ленінград.
Ленінград... і неўскія гулянкі...
Ёнк гітары.. ў зале бляск і ціш...
Мне юнацтва атруцілі рана.
Загубілі мэту ў жыцьці.

Некалі кулацкі сьпявака Язэп Пушча ў сваіх «Асеньніх песьнях» амаль гэтак-жа ўспрыняў пролетарскі цэнтр Ленінград. І тут Ананьнеў зьмыкаецца з гэтымі кулацкімі плёткамі пра пролетарскі горад:

«Душна мне сярод муроў і цяжка...
Мне-б цяпер у далях росных быць...
..: Я згубіла сэнс жыцьця і працы
(Так вясковы часта гіне люд)».

(«Рытмы буд.», стар. 223).

Гэтую ідэю гібеньня «вясковага люду» ў пролетарскім горадзе аўтар разьвівае ў поэме і далей. Выхад з становішча, зыходзіць з поэмы, трэба шукаць толькі ў звароце на вёску. Пра пролетарскае асяродзьдзе гораду ні гуку, яно абсолютна ігноруецца, абмінаецца, як нешта няіснуючае.

Усё гэта лішні раз сьведчыць пра тое, што халтура зьяўляецца формай мімікры буржуазна-кулацкай рэакцыі на літаратурным фронце, і ў прыватнасьці на фронце комсамольскай тэматыкі.

Гэткаю-ж халтураю, наборам агульных слоў і мэханічнай зрыфмоўкаю іх зьяўляюцца і вершы пра комсамол Зіны Бандарынай у зборніку «Веснацьвет» (вершы «Комсамол Беларусі», «Комсамол у паходзе» ды інш.).

Такім чынам, усе спробы паказу комсамолу ў поэзіі яшчэ зусім не адпавядаюць тым запатрабаваньням, якія высоўваюцца перад комсамольскай літаратурай нашай эпохай. Жыцьцё комсамолу нагэтулькі апярэдзіла ўсе гэтыя спробы, што можам сьцьвярджаць значнае адставаньне комсамольскай літаратуры наогул і поэзіі ў прыватнасьці ад тэмпаў рэконструкцыйнага пэрыоду.

БелАПП, тварам да комсамольскай тэматыкі, да комсамольскай літаратуры—гэткае патрабаваньне, на сёньнешні дзень высоўвае комсамол перад БелАПП'ам, бо гэтага покуль што няма.

Шмат новага здаровага сустрэнеце ў зборніку менскіх рабочых-ударнікаў.

Як дасягненьне, мы маем ужо творы пра комсамол, напісаным рабочымі-ўдарнікамі, комсамольцамі, як «Говар машын» (зборнік віцебскай філіі БелАПП, «Рытмы будаваньня») і «Людзі вялікіх спраў» (Маладняк № 9, 1931 г.) маладога пролетарскага поэта Андрэя Ушакова і інш., у якіх знаходзіць сваё адлюстраваньне гэроічнае змаганьне комсамолу на фронце соцыялістычнага будаўніцтва.

Міх. Вярнікоўскі

Мобілізавацца на баявое правядзеньне творчага агляду маладзёжнай літаратуры

Прамова сакратара ЦК УсеЛКСМ т. Косарава на III пленуме ЦК ЛКСМУ акрэсьліла **круты паварот** ленінскага комсамолу тварам да пролетарскага літаратурнага руху. Дыскурсія паміж «Комсомольскай Правдой» і кіраўніцтвам РАПП зьявілася магутным стымулем далейшага мацаваньня супрацоўніцтва комсамолу з пролетарскім літаратурным рухам.

Па ініцыятыве «Комсомольской Правды» разгортваецца творчы агляд маладзёжнай літаратуры. Першыя крокі, ужытыя па агляду ў РСФСР, паказваюць на вялізарнае значэньне гэтага агляду.

«Чырвоная Зьмена», падхапіўшы ініцыятыву «КП», яшчэ 14-га сьнежня мінулага году выступіла з заклікам неадкладна разгарнуць агляд беларускай маладзёжнай літаратуры.

Цэнтральны Комітэт ЛКСМБ у сваёй пастанове адзначыў вялізарнае політычнае значэньне творчага агляду і паказаў на шляхі яго правядзеньня.

У сьвятле сёнешняга стану супрацоўніцтва комсамолу з пролетлітаратурным рухам значэньне творчага агляду маладзёжнай літаратуры надзвычайна вялізарнае.

Комсамол вымагае ад пролетарскай літаратуры глыбокага, ідэёва-мастацкага высокага адлюстраваньня свайго гэроічнага змаганьня пад штандарам комуністычнай партыі. Асноўнае вымаганьне, што прад'яўляецца комсамолам да пролетлітаратуры, гэта патрабаваньне **стварыць вобраз станоўчага гэроя нашай эпохі, вобраз бальшавіка, ударніка, лепшага комсамольца.** «Стварыць «собирательные» тыпы гэрояў соцыялістычнага будаўніцтва і клясавага змаганьня, якія-б валодалі розумамі мільёнаў маладых працоўных, з якіх яны маглі-б браць прыклад» (Косараў)—ў гэтым патрабаваньне комсамолу.

Сёнешні стан адлюстраваньня комсамолу ў пролетарскай літаратуры, сёнешні паказ у літаратуры гэрояў соцыялістычнага будаўніцтва **ня могуць задаволіць рабочую клясу і ленінскі комсамол.**

Беларуская пролетлітаратура **недавальняюча выконвае свае абавязкі перад комсамолам.** У нас няма яшчэ глыбокага, паўнакроўнага адлюстраваньня комсамолу. Яшчэ ня створаны вобраз комсамольца-ўдарніка, комсамольца-гэроя. **Паказ комсамолу ў нашай літаратуры дужа часта лякіраваны, схэматычны, павярхоўны.**

Задача ў тым, каб праз творчы агляд уключыць комсамолію ў разгорнутае змаганьне на літаратурным фронце, **мобілізаваць масы комсамоліі на выкананьне першачарговых задач пролетарскага літаратурнага руху. Задача ў тым, каб па-баявому разгарнуць змаганьне за партыйную комсамольскую літаратуру.**

Правядзеньне творчага агляду маладзёжнай літаратуры характарызуе **ўзьняцьце супрацоўніцтва комсамолу з пролетлітаратурным рухам на вышэйшую ступень,** характарызуе далейшае **ўмацаваньне** гэтага супрацоўніцтва.

Плян усебеларускага творчага агляду маладзёжнай літаратуры, надрукаваны ў «Чырвонай Зьмене», уяўляе сабою разгорнутую програму дзеяньняў, програму змаганьня, кожнай комсамольскай ячэйкі, кожнага літгуртка за выкананьне задач, якія ставіць партыя перад пролетлітаратурай. Творчы агляд павінен ісьці праз шырокую распрацоўку лісту тав. Сталіна, рэалізацыі ўказаньняў гэтага лісту.

З часу агалашэньня творчага агляду маладзёжнай літаратуры ў БССР прайшло **шмат часу.** Аднак, разгортваньне агляду застаецца **нездавальняючым. Праароблена зусім нязначная, зусім недастатковая работа.**

У некаторай частцы і комсамольскіх організацый і пролетарскіх літорганізацый пануе **недаацэнка гэтага** вялізарнай важнасьці мерапрыемства.

Трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што БелАПП **стаіць яшчэ ў баку агляду.** Крытычныя сілы БелАПП да сёнешняга дню не заняліся справай агляду.

Толькі **некалькі** рабочых літаратурных гурткоў г. Менску распачалі агляд, распачалі прапрацоўку твораў, вызначаных у пляне агляду.

У г.г. Віцебску і Бабруйску праведзена толькі нязначная **падрыхтоўчая** работа да агляду (два вечары з нагляду).

Комсамольская ячэйка пісьменьнікаў ня прыступіла да выкананьня задач, пастаўленых перад ёю пастановай ЦК ЛКСМБ.

Такім чынам, у масах комсамоліі і пролетлітаратурнага руху **патрэбнага разгортваньня агляду яшчэ няма.**

Толькі шляхам безадкладнага павялічаньня ўвагі з боку «Чырвонай Зьмены», БелЛАПП'у, гаркомаў і райкомаў ЛКСМБ магчыма забясьпечыць **круты пералом** у разгортваньні творчага агляду.

Толькі шляхам мобілізацыі мас комсамолу, працоўнай моладзі і ўсястаноўкай дакладаў пра задачы пролетлітаратурнага руху магчыма зьдзейсьніць баявыя задачы агляду.

Да агляду яўрэйскай комсамольскай літаратуры

Тэмпы разгортваньня творчага агляду яўрэйскай комсамольскай літаратуры БССР нельга лічыць здавальняючымі. Усебеларуская нарада яўрэйскіх комсамольскіх пісьменьнікаў, агляд некалькіх комсамольскіх твораў у літгуртках Менску яшчэ да гэтай нарады, некалькі артыкулаў і рэцэнзій на старонках «Юнгер Арбэйтэр» і «Акцябр», прысьвечаных агляду,—вось і ўвесь надзвычай малы «актыў» агляду. Агляд яўрэйскай комсамольскай літаратуры яшчэ не набыў масавы характар, яшчэ не ператварыўся ў кампанію, што садзейнічае ўмацаваньню павароту ленінскага комсамолу да пролетарскай літаратуры. А гэта-ж менавіта зьяўляецца вырашальным для пасьпяховага правядзеньня агляду.

Як яўрэйская комсамольская газэта «Юнгер Арбэйтэр», так і яўрэйская сэкцыя БелАПП робяць яшчэ вельмі мала для таго, каб рэалізаваць і популярызаваць пастановы нарады яўрэйскіх комсамольскіх пісьменьнікаў. Работа па выпуску брашуры пра вынікі нарады ідзе недапушчальна марудна. Праўда, часопіс «Штэрн» за сакавік месяц цалкам прысьвячаецца пытаньням комсамольскай літаратуры, вынікам нарады ў прыватнасьці. Прадбачыцца таксама organізаваць абмен практыкай брыгад яўрэйскіх комсамольскіх пісьменьнікаў паміж Украінай і Беларусьсю. Гэта мерапрыемства павінна садзейнічаць вывучэньню практыкі Украіны, дзе агляд яўрэйскай комсамольскай літаратуры па тых вестках, якія ёсьць, ідзе больш пасьпяхова. Таму неабходна, каб БелАПП і ЦК комсамолу забясьпечылі адпаведную фінансавую базу для правядзеньня гэтага мерапрыемства.


Неабходна адзначыць, што Цэнтральны Штаб ЦК ЛКСМБ па правядзеньню агляда комсамольскай літаратуры фактычна ня кіруе аглядам наогул і аглядам яўрэйскай літаратуры ў прыватнасьці. Толькі 14-га лютага г. г. Цэнтральны Штаб заслухаў справаздачу яўсэкцыі БелАПП і рэдакцыі «Юнгер Арбэйтэр» пра прапрацоўную работу па агляду.

Цэнтральны Штаб павінен сыстэматычна і опэрацыйна кіраваць усімі дэталямі агляду.

Яўсэкцыя БелАПП разам з рэдакцыяй «Юнгер Арбэйтэр» надрукавала плян творчага агляду яўрэйскай комсамольскай і маладзёжнай літаратуры. Згодна пляну, літаратура, якая падпарадкваецца агляду, падзяляецца на сем тэматычных разьдзелаў: соцыялістычнае будаўніцтва, рэконструкцыя сельскай гаспадаркі і мястэчка, комсамол у быту, грамадзянская вайна і Чырвоная армія, гэроі пяцігодкі, барацьба комсамолу за рубяжом і крытыка комсамольскай літаратуры.

Творы яўрэйскіх комсамольскіх пісьменьнікаў разьбіты па адзначаных разьдзелах і плян, такім чынам, дае магчымасьць весьці агляд організаваным парадкам з тэматычнага пункту гледжаньня. (

Неабходна ў бліжэйшыя дні дабіцца карэннага пералому ў ходзе агляду яўрэйскай комсамольскай літаратуры. Літгурткі павінны ў аснову сваёй работы пакласьці агляд. І самае галоўнае: агляд павінен стаць справай усёй рабочай моладзі, комсамольскай масы—у першую чаргу. Цэнтральны Штаб, рэдакцыя «Юнгер Арбэйтэр» і яўсэкцыя БелАПП павінны зрабіць усё неабходнае для гэтага.



Першая кніга яўрэйскіх рабочых-ударнікаў друкарні імя Сталіна «Ударныя крокі».

У наступным нумары газэты «Літаратура і Мастацтва» друкуецца артыкул пра гэтую кнігу.

Юлі Таўбін

Урыўкі з аповесьці „Доктар Батурын“

«Доктар Батурын» — аповесьць, якой аўтар імкнецца разброіць інтэрвэнтаў на фронце культуры, навукі.

Проблемы навукі, культуры, мастацтва пры соцыялізме хвалююць цяпер колы рэволюцыйных пісьменьнікаў СССР. Гэтымі пытаньнямі займаюцца і буржуазныя пісьменьнікі.

У прыватнасьці і «Сумашедший корабль» Ольгі Форш і «Художник неизвестен» Кавэрына і «Охранная грамота» Пастэрнака—абараняюць ідэі культурнай інтэрвэнцыі, рэстаўрацыі ў СССР культуры старога расійскага Пецярбурга і сучаснага буржуазнага Захаду.

«Доктар Батурын» — аповесьць, якая павінна давесьці, што самая высокая, моцная, глыбокая культура, навука, самая прыгожае мастацтва вольнае ад капіталістычных «гандлярскіх» ланцугоў, творыцца і будзе створана ў СССР.

Гэты ўрывак паказвае старога спэцыялістага шкодніка доктара Батурына і рост новых спэцыялістых бальшавікоў, якія змаглі заплаціўшы сваёю крывёю ня толькі абараніць у грамадзянскую вайну маладую рэспубліку, але і стаць творцамі новай соцыялістычнай навукі.

ЮЛІ ТАЎБІН.

У горадзе гасьцявала халера.
Уначы
нехта біўся галавою ў вароты.
Месяц
белы, як папера—
Карантынным дазорцам
стаяў над плотам.
Быў тады вялікі неўрод.
Елі хлеб з саломаю—
цяжкі і горкі.
Сямігадовыя дзеці без бацькоў і двароў
Грызьлі на рынку
кавуновыя коркі.
А ў стэповых ставох,
з дзікунскаю веліччу
Падымала халера
крывы азіяцкі меч—
калі пасялковы маталыга і п'яніца—фэльчар
адзначыў першую невядомую сьмерць.
Заклікалі адозвы—
ня піць сырое вады,
сьцерагчыся гародніны,
мыць свае рукі варам..
І яшчэ
памёр
адзін маладзы,
папсаваўшы кветнік на гарачым бульвары.
І яна ўвайшла—
ціцком як і ўперад.
Санітары
сьпірытус глушылі ўпотай.
Уначы
месяц—
белы, як папера,
карантынным дазорцам
стаў над бальнічным плотам.
Па вуліцах глухіх
рыпеў за фургонам фургон.
Нехта біўся ў вароты—
жонка ці матка.
А пасьля упаў, заверашчэўшы, ён
з-пад брэзэнту ўглядзеўшы зялёную пятку.
Іх адвозілі за горад на маджжарах.
санітары ў чорных масках
і валілі ў яму—
пад гарачым шарам
сонца, ці пад месяцавым бляскам
палахлівым і сьцюдзёным—
белым, як папера..
І лічыў іх трупы
ашчадны аконам—
—Халера,

ЮЛІ ТАЎБІН



Дактары працавалі ночы на-пралёт.
Засыналі ў бальнічных халатах.
Пілі бром. Клалі лёд,
Праходзілі па палатах.
Барак трызьніць — жыцьцём, хаўтурным...
Мяшаюцца сьмерці, стогны, мыт—
у бараку спрачаюцца
Доктар Батурын
і доктар Шміт.
Батурын:
Мне даводзіцца ня верыць сваім вачам—
два месяцы працы—і вы ўжо тут, як дома.
Якое права вы маеце мяне навучаць?
Шміт:
Доктар Батурын...
Батурын:
Я доктар! Мне гэта даўно вядома!
Шміт:
Вы, доктар, гаворыце, пра нейкую вашу працу,
але нам ўгледзіць яе ня прыпала—
мы мелі толькі факт дэзорганізацыі
старэйшага мэдычнага пэрсаналу.
Батурын:
А!.. Вы адкрылі вашы карты! Так..
Гэта вам ня можа падабацца, разумееца...
Шміт:
НА ЯКОЙ ПАДСТАВЕ ВЫ НЯ ЎЗЯЛІ Ў БАРАК
ПАРТЫЮ ХАЛЕРНЫХ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ.
Батурын:
Я ня бог, каб лячыць нябожчыкаў...
Вы гаворыце, як профан..
Халера ня зьнішчаецца адным рошчыркам..
Трэба разумець агульны стан.
Я не раблю нічога крадком
і кажу вам у вочы—
Вы няўмека!
Шміт:
Я прымушаны буду зьвярнуцца ў Партком.
Батурын:
Найлепшае выйсьце
для інтэлігентнага чалавека...
Шміт:
Мала таго, што ваш сабатаж
падрывае працу па зьнішчэньню хворасьці..
Батурын:
Прашу не забывацца на мой стаж..:
Я не працаваў у воласьці..
Чуеце вы? Ротны фэльчар! Ён гроціць!
Канавал! Самавук! Ён пнецца ў паны,
Дзе працавалі вы да вайны?
Шміт:
Я працаваў у царскім вастрозе
на пасадзе політычнага адзіночніка
і ня меў лекарскае практыкі.
Батурын:
Я сам пакутваў дні і ночы,
а вы думаеце—
досыць апраткі—
і вы ўжо доктар, інтэлігент?
А я вам што?
Вялікодная пісаная?
Я ледзь усё не разьбіў ушчэнт!
Аднойчы мне пагражала высылка...
У мяне тут жонка хварэе на халеру
і я—разумееце,—
я—
маўчу.
А вы пагражаеце вышэйшаю мерай
Мне—
заслужанаму ўрачу.
Шміт:
Ніхто вам нічым не пагражаў!
Што гэта? Зноў! Новыя плёткі?
Мне цяжка з вамі размаўляць—
нажаль,
Вы ўжываеце нясумленныя сродкі.
Вы мяне папікаеце вастрогам у Шанкурску.
Батурын:
Вам добра зразумела, што рэч ня ў тым...
Шміт:
Так, мяне выключылі з трэцяга курсу..
Вы тады помніцца, былі на другім.
Вас ня зьмянілі ні падзеі, ні час
Вы так і засталіся панскім сынком..
Батурын!
У нас няма дактароў,
але яны, паверце, прыдуць з гадамі—
трэба працы, працы і працы зноў—
як ніколі, сумленнай і адданай.
Я, мабыць, ня гэткі спэц, як вы—
Ня было ў мяне часу ніколі на гэта.
Я больш да браўнінга звык.
Як да рыцыны ці лянцэта.
Але я пасланы сюды Парткомам
я раблю ўсё, што можна
і я цьвёрда пераконаны,
што халера будзе пераможана.
Я вас пытаю ў апошні раз,
як прадстаўнік тройкі па змаганьню з пошасьцю
Вы хочаце
працаваць у нас?
Ну?!
Я пытаюся ў апошні...
Батурын:
Калі вы ставіце пытаньне гэтак..
Шміт:
Мы можам паставіць яго ня так..
Батурын:
Я здымаю з сябе адказнасьць
перад цывілізованым сьветам
і пакідаю
халерны барак!
Шміт:
Прасьцей, кажучы, вы ўцяка..
Батурын:
Якое вы маеце права?
У мяне памірае Вера!
Можаце ісьці і ў Партком і ў ЧК—
у мяне памірае жонка ад халеры.
У мяне памірае жонка, але
я працаваў, пакуль мяне не кратаалі..
Шміт:
У мяне памірае Касьценіч Алесь—
стары таварыш па вострожных кратах..
Але гэта ня прычына.
Само сабой
Глыбей угледзецца калі—такі—
Вамі кіруе—
да хваробы боязьнь.
Ці—
меркаваньні з галіны політыкі...
ВЫ АДМОВІЛІ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАМ У ЧАСЕ ХВАРОБЫ.
ЯК
ВЫ ТЛУМАЧЫЦЕ ГЭТЫ ФАКТ?
Батурын:
Можаце тлумачыць, як вам да ўспадобы.
Я
пакідаю
халерны барак!
(выходзіць).
Шміт:
(крычыць ўсьлед)
Батурын!
Мы гэта расцэнім,
як політычны сабатаж..
Батурын:
(з-за дзьвярэй)
Я не баюся расстрэлаў!
Я не баюся турмаў!
Санітар:
(уваходзіць).
Памерлі № 43—Алесь Касьцевіч
і № 49—Вера Батурына.

***

Яшчэ на фронт заклікалі прамовы.
Паміралі
ад куль і сыпняку.
Пасялілася
новая моладзь
у дваранскім асабняку.
Чысьценькія
беленькія профэсары
зашпілялі каўнерыкі,
прыходзілі ў «бурсу»
і спалохана пачыналі гаварыць
уступныя прамовы да курсу.
«Бурса» сядзела ў шынэлях, валёнках
і ня супярэчыла традыцыйнай прамове,
зрэдку папраўляючы сівага дзіцёнка,
калі той зьвяртаўся да іх:
«панове»..
І доўга
Прафэсары ўспаміналі
пра першую стрэчу з тымі,
каторыя
напоўнілі анотомічныя залі
і опэрацыйныя аўдыторыі.
Каторыя—
ў калідорах клінік,
перамагаючы
ў жылах дрож,
рукамі,
звычнымі да цаглінак
за хірургічны браліся нож.
Каторыя—
прайшоўшы войны і мукі,—
капаліся ў схэмах раскопак,
вачамі
прызвычаенымі да мушкі,
лавілі прыцэл мікроскопа.
Гэта ішлі
на свае пасты
мэталісты і земляробы,
Вучыць дзяцей.
Будаваць масты.
Лячыць людзкія хваробы.
Іх клікаў—
барвовы штандараў мошаст,
халера, голад, сыпнякі—
яны выходзілі на пошасьць—
бальшавікі—выпускнікі.
І працавалі ночы напралёт.
Засыналі ў больнічных палатках.
Пілі бром. Клалі лёд.
Праходзілі па палатках.
Гаварылі па простым провадзе.
.. Прапрацую гадзіны з тры...
Пад спакойны сум оркестровы
падымалі труну сябры.
Выжывалі.
Жылі,
праз ночы—
недаспаныя і перагружаныя,—
неспакойныя думы праносячы.
Так халера была адужана
і забыта ў паданьнях даўніх.
Так прышоў
баец комуніст—
Савецкі ўрач,
Савецкі настаўнік,—
Савецкі спэцыяліст.
Сьнежань 1931 г.
Люты 1932 г.

НА АСНОВЕ БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ РАЗГОРНЕМ ТВОРЧУЮ ДЫСКУСІЮ

Бальшавіцкае мастацтва не магчыма стварыць без адзіна-рэволюцыйнага сьветапогляду—марксызму-ленінізму

ПЛАТОН ГАЛАВАЧ

Слова ў творчай дыскусіі

Свой артыкул я пачну невялікімі, спадзяюся, усім вядомымі вытрымкамі з пастаноў XVII партконфэрэнцыі па дакладах т. Молатава і Куйбышава.

«Конфэрэнцыя лічыць, што асноўнай політычнай задачай другой пяцігодкі зьяўляецца канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і кляс наогул, поўнае зьнішчэньне прычын, якія параджаюць клясавую розьніцу і эксплёатацыю, і перамаганьне перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і **сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага соцыялістычнага грамадзтва».**

«Новыя посьпехі соцыялізму рабочая кляса забясьпечыць толькі ў змаганьні з рэшткамі капіталізму, даючы бязьлітасны адпор супраціўленьню гінучых капіталістычных элемэнтаў, перамагаючы буржуазныя і дробнабуржуазныя забабоны сярод працоўных і вядучы настойлівую работу па соцыялістычнаму выхаваньню працоўных».

Варта ўдумацца ў глыбокі, надзвычайна глыбокі сэнс гэтых простых, зразумелых самым шырокім масам слоў (мы, пісьменьнікі, часта ня ўмеем пісаць так проста і глыбока, каб сумясьціць надзвычайнае багацьце зьместу і сьцісласьць слоў),—каб зразумець, што ні ў аднэй з краін сьвету ніводзін пісьменьнік ня меў і ня мае перад сабой такіх вялікіх магчымасьцяй і такіх неабдымных сваім значэньнем для ўсяго чалавецтва, стымулаў у сваёй творчай рабоце, якія маюць пролетарскі і савецкі пісьменьнікі.

Вось чаму, нельга сёньня мысьліць творчую работу пролетарскага і савецкага пісьменьнікаў без уважлівага і глыбокага вывучэньня пастаноў XVII партконфэрэнцыі.

Шэраг мейсц з гэтых пастаноў, у прыватнасьці мейсцы, якія я прыводзіў, зьяўляюцца непасрэднымі дырэктывамі нам, пролетарскім пісьменьнікам, дырэктывамі конкрэтнымі і вялікімі. Адсюль творчая дыскусія, распачатая ў МенАПП дакладам т. Лынькова, павінна быць праверкай таго, наколькі актыўна мы сваёй творчай работай удзельнічаем у пабудове соцыялізму і наколькі падрыхтаваныя мы для выкананьня задач, якія паставіла перад намі XVII партканфэрэнцыя. У гэтым напрамку я і буду гаварыць пра сваю творчую работу і пра творчую работу другіх таварышоў.

Са ўсяго напісанага мною вартым таго, каб хоць у нейкай ступені называцца творам мастацкае літаратуры, я лічу толькі сваю аповесьць «Спалох на загонах». Аднак для мяне сёньня зусім ясна, што найбольш характарныя рысы майго творчага мэтоду ўжо вызначаліся ў такіх маіх апавяданьнях, як «Перад канцом», як «Уцякач», як «Сьвежы вецер» і «Кара», апавяданьнях, якія, праўда, маюць шэраг зрываў. Рэшта напісанага мною—гэта больш ці менш удалыя спробы пісаць мастацкае апавяданьне і нават аповесьці (я кажу пра «Вінаваты»).

І калі ўсё папярэдне напісанае мною зьяўляецца спробай працаваць у мастацкай літаратуры, дык «Спалох на загонах»—гэта ўжо твор, у якім я сьвядома працую над рэалізацыяй асноўных палажэньняў свайго творчага мэтоду, гэта вызначэньне творчага напрамку, у якім я працую і буду працаваць у далейшым.



Мае творчыя памылкі

Асобныя з іх крыюцца зусім ня ў тым, у чым бачаць іх асобныя таварышы. У гэтым сэнсе я лічу што варта было-б гаварыць пра самае характарнае для мае творчасьці, менавіта пра «Спалох на загонах», але, паколькі т. Лынькоў гаварыў пра памылкі аповесьці «Вінаваты», я спынюся і на гэтай аповесьці.

У чым памылка гэтай аповесьці? Ці ў тым, як думае т. Лынькоў, што я спачуваю «пакрыўджанаму» партыйцу чалавеку (дарэчы ня партыйцу, а партячэйкай, бо ЦКК, па аповесьці, аднавіла Шаўца ў радох партыі),—і гэтым дэмобілізую, як кажа т. Лынькоў, нашае змаганьне за клясавую пільнасьць? Спачуваньне маё да героя аповесьці зусім законнае, бо ён наш чалавек, і справа ня ў тым што ягоны бацька служыў у ахранцы. Памылка ня ў гэтым. Памылка ў тым, што я ўзяў зусім правільнае пытаньне і паставіў яго, што называецца на галаву. Што было галоўным у часе чысткі савецкага апарату і ВНУ? Галоўным было ачыстка ад клясава-варожых. Гэта агульнае. Прыватнае, адзінічнае ад гэтага: чысьціць так, каб адрозьніваць і не «пакрыўдзіць», дазвольце ўжыць гэты тэрмін, клясава-сваіх людзей. У мяне пытаньне пастаўлена наадварот. Прыватнае ў мяне пастаўлена на месца агульнага і адсюль усе грахі.

Цяпер пра «Спалох на загонах».

Я лічу, што «Спалох» ня «робіць спробу закрануць важнейшае пытаньне соцыялістычнае рэконструкцыі нашае вёскі» (Альшэўскі),—такі твор быў-бы нічога ня варты,—а бярэ гэтае важнейшае пытаньне сваёй тэмай. Адсюль і сур'ёзнасьць патрабаваньняў, што ставяцца да аповесьці.

І т. Бэндэ, і т. Альшэўскі, і т. Лынькоў і шэраг другіх таварышоў гаварылі пра памылкі гэтае мае аповесьці.

Т. Альшэўскі, у прыватнасьці, бачыць у аповесьці два асноўныя недахопы. Першы з гэтых недахопаў, па Альшэўскаму, крыецца ў тым, што «рух сялянскіх мас да калгасаў паказаны ў асноўным, як стыхійны рух, як самацёк» (Альшэўскі—«Зьвязда», 6-XII—31 г.), а па т. Лынькову («Літаратура і мастацтва», № 1) «...як разьвязаная нічым нястрыманая стыхія». Колектывізацыя (па т. Лынькову) у аповесьці адрываецца ад агульнага ходу гістарычных падзей ува ўсёй краіне, яна не абумоўліваецца ў сваім разьвіцьці ўсім папярэднім этапам разьвіцьця краіны».

Варта ўдумліва прачытаць аповесьць, каб з гэтым не згадзіцца.

У першыя ўжо годы пасьля рэволюцыі ў вёсцы дзе-ні-дзе організоўваюцца сельскагаспадарчыя комуны. Організоўваюцца яны ў большасьці комуністамі, былымі чырвонаармейцамі, якія варочаліся з фронту. Па свайму складу, у асноўнай масе сваёй—з былых парабкоў маёнткаў і на зямлі былых маёнткаў. Такая і Новікаўская комуна з мае аповесьці.

1929 г. і пачатак 1930 г.—гэта пачатак ужо масавага колгаснага руху. А што было ў пэрыяд да гэтага? А да гэтага ў вёсцы, дзякуючы рабоце парт'організацый, узорнай рабоце комун, ішоў процэс паступовага нарастаньня масавага колгаснага руху, процэс, у выніку якога беднята і асноўная маса серадьнякоў павярнула на шлях соцыялістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі.

Масавы колгасны рух (у аповесьці) разгортваецца і нарастае ў далейшым зусім ня стыхійна. З першых ужо дзён у сельсавеце працуе прадстаўнік партыі Панас. А да гэтага сяляне з Цярэшкавага Броду чулі пра Новікаўскую комуну, асобныя з іх уступалі ў самую комуну. І яшчэ. Панас працу вядзе не адзін. З ім старшыня сельсавету. З ім пазьней ужо—рабочая брыгада, і самае галоўнае, без чаго нічога нельга было-б зрабіць і што зьяўляецца вынікам організатарскай Панасавай работы,—гэта формаваньне вясковага колгаснага актыву, тых трынаццаці, якія ў самую цяжкую хвіліну засталіся ў колгасе, і тых трыццаці-двух сялян суседняе вёскі, якія прышлі ў колгас да гэтых трынаццаці. Прычым для гэтых 32 колгас «Парыская комуна» быў рэальным уяўленьнем таго, пра што яны чулі яшчэ раней на фронце, за што змагаліся. Панасава работа, як работа прадстаўніка партыі і стварэньне колгасу, як вынік гэтае работы, дапамаглі гэтым 32 канчаткова вырашыць пытаньне, куды ісьці. Дык дзе-ж тут стыхійнасьць? Яна выдумана, прыцягнута, як кажуць, за вушы.

А да ўсяго таварышам крытыкам варта-б ведаць і тое, што ў рэчаіснасьці ў колгасным руху, у часе самага вялікага ягонага ўздыму мела месца і стыхійнасьць, хаця, безумоўна, галоўную, вырашальную ролю іграла, ды інакш і быць не магло, організатарская работа нашых партыйных ячэек, райкомаў. У шэрагу месц гэты рух перарастаў організацыйныя здольнасьці сельсаветаў і партячэек, і прычынай выхадаў з колгасаў, побач з перагібамі, было і тое, што організацыі ў шэрагу мейсц ня справіліся з гэтым рухам, не змаглі яго замацаваць. Гэта было там, дзе было мала партыйных сіл.

Галоўны недахоп аповесьці, такім чынам, ня ў тым, што колгасны рух паказаны як «разьвязаная, нічым ня стрыманая стыхія», гэтага якраз няма. Галоўны недахоп аповесьці ў далёка недастатковым, невыстарчальным паказе праз райком, праз Панаса і рабочую брыгаду, партыйнага кіраўніцтва колгасным рухам, вобразу бальшавікоў, ролі рабочых у організацыі гэтага руху. Аднак змазваньня «ролі рабочай клясы, пролетарскага гораду і нашай партыі», як гэта кажа т. Альшэўскі, у аповесьці няма.

Адна з памылак аповесьці ў тым, што, каб апраўдаць канец аповесьці, я надаў Панасу шэраг зусім неўласьцівых яму рыс. Адсюль у яго моманты незразумелая пасыўнасьць, недастатковая клясавая пільнасьць. Па гэтай прычыне ён ня змог, пры ўсёй сваёй рабоце, своечасова выкрыць клясавага ворага, які вёў змаганьне супроць колгасу.

Некалькі слоў пра ўступ да аповесьці

І т. Альшэўскі, і т. Лынькоў знаходзяць ва ўступе шэраг памылак.

Вось што піша т. Альшэўскі

«Па-першае, прадмова прабуе намаляваць чалавека, як нешта, што жыве па-за клясамі, па-за соцыяльнай абстаноўкай».

Той, хто чытаў аповесьць, памятуе, што ва ўступе гутарка ідзе пра чалавека не па-заклясавага. Там вельмі выразна гаворыцца, што гэты чалавек еў хлеб з асьцюкамі, жыў у бруднай, цеснай, халоднай хаце. Калі гэты чалавек быў на фронце, другія людзі пілі віно, балявалі, а ягоная жонка прасіла кавалак хлеба ў багатага суседа-кулака. І гэта па-заклясавы чалавек, дазвольце запытаць у вас? Чалавек з майго ўступу, гэта Пётра Ашурак, гэта Клемс, гэта дзесяткі і сотні другіх беднякоў і серадьнякоў Беларускае вёскі, якія вызваляюцца сёньня ад свайго галоднага існаваньня, будуючы ў колгасе новае, разумнае жыцьцё. Далей т. Альшэўскі піша:

«Па-другое прадмова містычна, ідэалістычна паказвае сутнасьць нашай рэволюцыі. Для доваду—некалькі цытат. Галавач малюе рэволюцыю і адносіны да яе чалавека ў наступных словах: «Ня ведаючы ніякіх непарушных сьвятынь, неабцяжараная рызьзём пашаны да ніколі не існаваўшых вечных ісьцін, ведаючы толькі адно, што ўсё што ёсьць—ёсьць продукт яе творчасьці, яна карысталася правам разбураць усё, што перашкаджае яе росту». «А наўкола яе, на яе шляху былі: руйнаваньне і будаўніцтва; замілаваньне і жудасьць; радасьць і сьлёзы; голад, сьмерць і надзея; адданасьць і недавер'е; роспач і вера ў яе». «...Яна ішла і клікала кожнага з людзей, да любові народжанай у ненавісьці, каб ня было на зямлі паміж людзьмі людзей, што загадваюць, і людзей падуладных; каб ніколі ўжо ня было зьдзекаў чалавека над чалавекам...» «Парушаючы векавыя традыцыі, яна нешчадна рвала ланцугі старога і вызваляла людзей. І таму яна адных узрадавала, другіх зьдзівіла сьмеласьцю сваіх імкненьняў, у трэціх узбудзіла надзею, у чацьвертых—страх і схаваную нянавісьць да сябе, пятых адкінула ад сябе, як непатрэбнае».

Я не адмаўляю, што тут маецца зрывы ідэалістычнага парадку.

Спакусіў уступ і т. Лынькова. Ён кажа: «У самым уяўленьні рэволюцыі, у паказе яе пераможнага наступу, у ўспрыняцьці самой рэволюцыі пісьменьнікам мы знаходзім паасобныя элемэнты дробна-буржуазнага ўспрыняцьця рэволюцыі, як нечага страшнага, жудаснага, недасяжнага». І т. Лынькоў цытуе: «Цяжка бачыць яе вышыні і было страшна перад высокім». Не адрывайце, таварыш Лынькоў, уступу ад усяго зьместу аповесьці і вам стане зразумелым, што ня пісьменьніку цяжка бачыць вышыні рэволюцыі, а шмат каму з тых, пра каго ідзе гутарка ў аповесьці.

У аповесьці, па-мойму, надзвычайна багата слабых мейсц. Я лічу, што ў аповесьці багата мясьцін павярхоўных, схэматычных. Успомніце хоць-бы паказ парткому, чаргі. Шаблонна паказаны і абывацелі.

Але ў чым-жа вартасьць аповесьці? Я лічу, што вартасьць аповесьці «Спалох на загонах» заключаецца ў тым, што яна, пры наяўнасьці вялікай колькасьці недахопаў, усё-ж у значнай ступені, шэрагам мейсц і асноўнай сваёй ідэяй раскрывае і паказвае існыя бакі нашае конкрэтнае рэчаіснасьці (вясна 1930 г.), організоўвае рэчаіснасьць, выражае яе праз адну асноўную ідэю.

Пра творчы мэтад

Я лічу крытэрыем мастацкае вартасьці твору любога пісьменьніка тое, наколькі ён раскрывае існыя бакі нашае рэчаіснасьці. Чаму я бяру крытэрыем мастацкае вартасьці твору тое, у якой ступені пісьменьнік раскрывае існыя бакі дадзенай гістарычна-конкрэтнай рэчаіснасьці? Я гэта раблю, выходзячы з таго, агульна-вядомага палажэньня, што мастацтва, а значыць, і мастацкая літаратура, зьяўляючыся магутным сродкам у справе перабудовы сьвету, зьяўляецца адным са сродкаў ягонага пазнаньня. Прычым, гэта вельмі важна, у гэтай справе мастацтва—літаратура—опэруе сваімі спэцыфічнымі сродкамі.

Як я разумею, з пункту гледжаньня асноўных палажэньняў майго творчага мэтоду, работу пісьменьніка над вывучэньнем і паказам рэчаіснасьці?

Пролетарскі пісьменьнік мае перад сабой непасрэднае быцьцё рэчы, зьявы. Але ён павінен раскрыць іхную існасьць, законы і прычыны. Гэтыя законы і прычыны, гэтую існасьць зьяў і рэчаў пролетарскі пісьменьнік павінен пазнаваць і ўскрываць на падставе вывучэньня практыкі, накопленай чалавецтвам, на падставе соцыяльнае практыкі свае клясы, сваіх назіраньняў і сваёй практыкі. А паколькі рэчаіснасьць надзвычайна разнастайная, багатая супярэчнасьцямі, яна ня можа быць пазнанай праз знаёмства толькі з аднымі зьявамі, без пазнаньня існасьці процэсаў. Пісьменьнік, абагульваючы і параўноўваючы зьявы, аналізуючы і сынтэзуючы іх у сьвятле сьветапогляду свае клясы, павінен ускрываць іхную існасьць і законы, каб скласьці сабе правільнае ўяўленьне пра об'ектыўную дыялектыку рэчаіснасьці, без чаго ён ня зможа актыўна дзейнічаць у адносінах да рэчаіснасьці.

Пролетарскі пісьменьнік, які стаіць на позыцыях дыялектычнага матэрыялізму, мае ўсе падставы, каб найбольш поўна і правільна вырашыць гэтую задачу. Таму творчасьць пролетарскага пісьменьніка будзе найбольш об'ектыўнай і дзейнай. Гэта значыць, што пролетарскі пісьменьнік будзе бачыць процэс разьвіцьця грамады і асноўныя сілы, якія рушаць гэты процэс і азначаюць яго разьвіцьцё; ён зможа і будзе паказваць нараджэньне новага ў старым, заўтрашняга ў сёньнешнім, змаганьне і перамогу новага над старым. І гэтае значыць, што пролетарскі пісьменьнік будзе ня толькі тлумачыць сьвет, але і сьвядома працаваць у справе ягонае зьмены.

Гэта самы цяжкі шлях, але менавіта гэты шлях павінен быць творчым шляхам таго пролетарскага пісьменьніка, які хоча сур'ёзна працаваць над стварэньнем вялікага мастацтва эпохі будаўніцтва соцыялізму. Лінія найменшага супраціўленьня—гэта лінія фактографіі, гэта поўзаньне па паверхні зьяў, гэта ў лепшым выпадку малакроўная «рэволюцыйная» лірыка, а ў горшым—гэта проста чырвоная халтура.

Паколькі мастацкая літаратура мае справу перш за ўсё са зьявамі грамадзкімі, з чалавечай грамадой, з людзьмі і іхным жыцьцём,—асноўнае ў маім творчым мэтодзе—чалавек, чалавек жывы, у ягонай клясавай практыцы.

У вытрымцы з пастаноў XVII партконфэрэнцыі, якую я прыводзіў у пачатку свайго слова, ставіцца задача соцыялістычнага перавыхаваньня працоўных. Дык вось вырашаць гэтую задачу здольна будзе менавіта літаратура, якая будзе даваць не хадульных і выдуманых герояў, не малакроўных людзей, ня зробленых па стандарту, штамповачна ўдарнікаў рабочых і колгасьнікаў, а жывых людзей у іхнай клясавай практыцы. Чалавек, паказаны творчым мэтодам дыялектычнага матэрыялізму, гэта клясавая існасьць чалавека азначанае клясы, азначанае соцыяльнае групы.

Возьмем конкрэтны прыклад. У змаганьні за соцыялістычную рэконструкцыю сельскай гаспадаркі аднэй з важнейшых задач зьяўляецца задача вызваленьня селяніна бедняка і серадняка з вельмі моцных яшчэ, цэпкіх лап уласнасьці. Пра колектывізацыю ў нас напісана нямала і бэлетрыстычных і поэтычных твораў. Прычым з гэтае колькасьці вельмі мала добрага. Возьму адну з характарных для цэлага раду кніг, кнігу Чалядзінскага, якая выдадзена ў 1930 г. Як літаратурны факт, гэтая кніга не заслугоўвае ўвагі, але яна зьяўляецца характарнай у справе пашырэньня халтуры і па мэтоду паказу колектывізацыі зьяўляецца характарнай для шмат якіх апавяданьняў, нарысаў і вершаў.

Пра сьпевы колгасных жаўранкаў...

Як-жа паказвае процэс колектывізацыі гэты аўтар? Вось расстаноўка клясавых сіл у вёсцы ўвесну 1930 г., праўда, па жаночай лініі, аўтар у большасьці дае тыпы жанчын, як найбольш адсталых.

«Адны,—піша ён,—у асноўнай сваёй масе з бедняты і серадняцтва, прайшоўшыя дэлегацкія школы, складаюць наш актыў у вёсцы...

Другія—з варожа клясавага (?) лягеру, кулачкі і падкулачніцы, крыксухі... Трэція—«старушкі» (тож соцыяльная катэгорыя!—П. Г.), што трымаюць сябе пасыўна. ад печы і з хаты ня вылазяць».

А дзе асноўная маса бядняцак і серадняцак, якія не зьяўляюцца актывам і не зьяўляюцца падкулачніцамі? Яны зьнікі і зьнікі таму, што аўтар ня ведае, што з імі рабіць, бо яны і не падкулачніцы, але на сходах многія з іх, паддаўшыся агітацыі кулакоў, часта выступалі супроць колгасаў і выступалі актыўна. Аўтар проста баіцца іхняга паказу, бо яны ня ўлазяць у яго схэму. Куды лягчэй паказаць проста актывістак і падкулачніц. І аўтар так і робіць, а ад гэтага людзі ў ягонай кніжцы гавораць або за колгас (актыў), або супроць (кулакі і падкулачнікі).

«Ходзіш, просіш, енчыш—за лічаныя грошы не дастанеш!—кажа сялянка, і, па аўтару, яна бясспрэчна-ж кулачка. Аўтар са смакам абзывае яе кулачкай.

«— Але-ж, але, заганяюць..: І я-ж кажу, заганяюць у сіцыялізму!»—гэта таксама кулачка.

Затое актыў гаворыць у аўтара вось якой моваў.

«— Гэ-э-э-э, васпані, даўней бывала!? Даўней бывала—пані з мужыка скуру драла, а цяпер слабода!—Памаладзецку адпаліў і захадзіў козырам па пакоі». А вось гавора жаночына пра колгас:

А вось хлапчук, маленькі зусім яшчэ. «Залезе кожную раніцу за комін і галёкае. «Далоў, далоў манахаў, далоў, далоў папоў!» і г. д. Гэта зноў выдуманы аўтарам хлапчук. І аўтар сам ад яго недалёкі: «Падыходзячы да райкому КП(б)Б,—кажа аўтар,—мой язык (бачыце, язык умее хадзіць!—**П. Г.**) чамусьці міжвольна дэкламаваў лёзунгі:»

«— Наладзім экскурсію беднякоў-неахцімцаў у колгасы!

— Кнігу і газэту масам!

— Даёш рабочыя брыгады ў вёску!»

Гаворачы пра тое, як вызванывалі ў царкве званы: «Дай блін, дай блін»,—аўтар ад сябе дадае: «—Ні бліна, ні капейкі ня было каму дармаедам пасуліць...» Як, бачыце, ніякіх цяжкасьцяй, усё ідзе як па маслу.

І ня толькі людзі за колгас, але і жаўранкі і вароны.

На 49 стар. свае кнігі аўтар кажа:

«— Цяпер і жаўранак над колгасным полем пяе: «Калякцыў—каперацыў. Калякцыў-каперацыў».

А вароны, лятучы бывала над хатай бедняка крычэлі: «—Кя-алом, ка-алом, ка-алом...» А цяпер: «Кол-гас, кол-гас!».

Як бачыце, нават птушкі ідэолёгію зьмянілі. Варта было-б запытацца, дзе толькі быў розум у політрэдактара?

Яшчэ раз кажу, што мэтод паказу колектывізацыі Чалядзінскім, уласьцівы ня толькі халтуршчыкам, тады гэта было-б ня так страшна, ён уласьцівы і шэрагу апавяданьняў і нарысаў другіх таварышоў і маладых і ня зусім маладых. З такой зброяй супроць сілы ўласнасьці змагацца нельга.

Процэс вызваленьня селяніна ад сілы ўласнасьці, гэта процэс складаны, цяжкі. І той твор, які зможа найбольш глыбока і праўдзіва паказаць гэтую складанасьць, часта мучыцельнасьць процэсу, той твор з максымальнай сілай будзе дапамагаць гэтаму процэсу, будзе пераконваць селяніна ў неабходнасьці будаўніцтва соцыялістычнае сельскае гаспадаркі.

Мае творчыя спрэчкі з тав. Александровічам

Зараз я пераходжу да апошняе часткі свайго слова, да разгляду асобных твораў т. Александровіча. Творчасьць т. Александровіча я бяру таму, што лічу свой творчы мэтад у многім супроцьлеглым творчаму мэтоду т. Александровіча.

Творчасьць т. Александровіча ў беларускай пролетарскай літаратуры займае і па праву значнае мейсца. Актуальнасьць, політычная завостранасьць, насычанасьць нянавісьцю да клясавых ворагаў,—гэтым характарны найболь значныя творы т. Александровіча. У гэтым сэнсе асабліва характарным зьяўляецца «Цені на сонцы». «Цені на сонцы» гэта своеасаблівы жанр політычнай сатыры, сатыры насычанай непрымірымай нянавісьцю да нашых клясавых ворагаў. У М. Горкага ў адным з артыкулаў ёсьць мейсца, дзе ён адсутнасьць сатыры тлумачыць адсутнасьцю ў пісьменьнікаў патосу ненавісьці да адмоўных фактаў. Дык вось твор «Цені на сонцы» сьведчыць пра тое, што ў т. Александровіча гэты патос нянавісьці ёсьць. «Цені на сонцы», на мой погляд, зьяўляюцца і творам найбольш мастацка моцным.

Аднак, нельга таго-ж сказаць пра «Поэму імя вызваленьня» і пра «Нараджэньне чалавека». У гэтых творах, па прычыне ўплываў літфронтоўшчыны, асабліва выразна выступае ўся прарочнасьць творчага мэтоду т. Александровіча, і ў сілу гэтага творы гэныя не адыгрываюць тае ролі, якую яны павінны былі-б адыгрываць. Творы гэныя маюць шэраг сур'ёзных зрываў творчага парадку, якія паслабляюць іх дзейную сілу.

Некалькі слоў пра «Поэму імя вызваленьня». Гэты твор я бяру як найбольш характарную зьяву для літаратуры, якую я назваў-бы «абезчалавечанай» у тым сэнсе, што ў творы зусім няма людзей, няма ў поэме і дзеі. Па гэтай прычыне гэты твор перастае быць поэмай, мастацкім творам і робіцца зарыфмаванай хронікай падзей за 10 год існаваньня БССР. Вы можаце некалькі разоў перачытаць гэты твор і ў вашай памяці не застанецца нічога акрамя некалькіх удала зробленых лёзунгаў. Гэты твор ні ў якой ступені не дае нам паказу гэроічнага змаганьня рабочых і сялян у будаўніцтве соцыялістычнай Беларусі.

«Нараджэньне чалавека» твор, які вельмі багата абяцае. Пра гэта гаворыць і сама ягоная назва.

Сваім зьместам роман ахапляе значны адрэзак часу, пачынаючы з канца грамадзянскай вайны і канчаючы гэтак прыблізна 1928-29 гадамі. Гэта дае аўтару, як і сам памер роману, вялікія магчымасьці, каб паказаць клясавае змаганьне ў краіне, ва ўмовах якога вядзе соцыялістычнае будаўніцтва рабочая кляса, паказаць самае гэтае будаўніцтва, што значыла-б паказ умоў, у якіх і ідзе формаваньне новых людзей. І аўтар робіць спробу так; менавіта паказ, даць. Наколькі аўтар справіўся з сваім заданьнем, мы зараз убачым з шэрагу вытрымак з роману, якія я лічу патрэбным прывесьці.

Вось паказ клясавых ворагаў:

«Санітар Аўзор Дарубашвілі
Жыве багата ў гэткі трудны час.
Аб ім шапталіся, казалі, гаварылі...
«Нешта ёсьць»—насілася ня раз.
І цяпер вісяць на вуснах чуткі,
Быццам нейдзе нейкі загавор.
Панавалі зграяй гутаркі—пагудкі,
Шыта,-крыта — хітра працу вёў Аўзор.

Ужо ня хітра, калі хадзілі чуткі.

Гэты шпіён вядзе актыўную контррэволюцыйную работу.

На контррэволюцыйным сходзе Дарубашвілі робіць даклад.

За ім слова бярэ гандляр. Як-жа гаворыць гэты гандляр? А вось паслухайце.

«— Заўчора, ўвечары, мясцовы камісар
Зрабў з чэкістамі ў мяне нахальны вобыск.
І вось бяда! Ці-ж лёгка расказаць!?
Пазабіралі золата, даляры».

А пасьля зноў Дарубашвілі, сьцішаючы сход, кажа:

«Зьніштожым камісара!
О, браты! Вялікі наш загавор
Мы мусім выканаць!»

Кідаецца ў вочы ўпрашчэнства ў паказе клясавых ворагаў. Гэтае ўпрашчэнства асабліва ў паказе гандляра. Як нам вядома клясавы вораг заўжды выступае замаскаваны, хаваючыся за крыкі пра вольнасьць, пра інтарэсы ўсяго народу, а не гаворыць да мас: браты, ідзеце супроць савецкае ўлады, бо яна ў мяне золата адабрала. Гэта занадта наіўны вораг. У жыцьці такіх наіўных ворагаў мала.

Гэтым, па сутнасьці, вычэрпваецца паказ у романе клясавых ворагаў гэтага раду. Характарная для гэтага паказу—схэма. Аўтар не дае поўнакроўнага вобразу клясавага ворага, а таму і не раскрывае, ня можа ўскрыць у сваім паказе гандляра, Дарубашвілі і шпіёнкі, клясавай існасьці нашага ворага, той існасьці, якая заключаецца ў шалёнай яго нянавісьці да нас, у змаганьні супроць нас. Глыбока ўскрыць гэтую клясавую існасьць ворага—гэта значыць, організаваць масу працоўных на змаганьне супроць яго. Схэматычны паказ клясавага ворага ня здолен мобілізаваць масы, выхоўваць у яе непрымірымую нянавісьць да клясавых ворагаў.

Яшчэ адна заўвага да гэтае часткі майго артыкулу. У романе ёсьць шэраг месц якія, па аўтару, павінны гучаць перасьцярогай, што вораг яшчэ жыве, што нам патрэбна клясавая пільнасьць. Аднак, гэтыя мейсцы зроблены так, што яны спрашчаюць аж да вульгарызатарства нашае змаганьне з клясавым ворагам, або часам паміма волі аўтара гучаць гіроніяй над клясавым змаганьнем. Вось некалькі вытрымак:

«Нязнаны росквіт, рост магутны наш,
Зьнішчожыць, затрымаць імкнуўся шпіонаж.
Але зьнішчожылі, як трэба і чакаць.
Не нас яны,
А іх ЧК.
———

Гэта слова «зьнішчожылі» — гучыць гіроніяй.

І яшчэ:

Раптам крык; нажом сенсацый
Адарваў народ ад працы:
— Вораг клясавы іяноў
Пролетарскую п'е кроў.
— Пяць капеек:..
У дужках (колькі шуму!..)
Вось газэтка!
— Сьвежы нумар!
— Набывалы ўчынак гэткі!
— Пяць капеек!
— Вось газэткі!

У гэтых радкох, паміма волі аўтара, па прычыне няўважлівых адносін да свае работы, **гучыць гіронія на адрас клясавага змаганьня.**

Некалькі вытрымак, якія даюць паказ астаноўчых тыпаў роману. Вось Рыгор:

Высокі і стройны.
Стройны і горды.
Упэўнена цьвёрда ступае нага.
Красуе на куртцы
Чырвоны ордэн,
З правага боку
Наган.

Вось вам тыповы вобраз-схэма, хадульны лубачны гэрой. Гэтак-жа схэматычны і прамовы сьледчага ЧК і чырвонаармейца.

Далей Марыля ў штабе чакае, ці знойдае чырвонаармеец у сьпісах Рыгора. Чакае, а

Дзявочае сэрца ў трывозе слабее—
Рашаецца права жыцьця. (?).
«— Берагла—захоўвала
У цярплівасьці цяжкай,
Яму, Рыгору любаму,
Дзявочы гонар свой.
А што калі няма яго,
Няведама дзе ён?

Бачыце, якая вялікая проблема хвалюе Марылю? І хвалюе доўга. Ужо знайшоўшы Рыгора, яна думае сказаць ці не, што—

«Сябе зьберагла,
зьберагла для цябе»,—...

Акрамя мастацкае слабасьці гэтых мясьцін, бачыце, часам і сэнс іхны ня зусім удалы.

Гэтыя мясьціны надзвычайна слабыя мастацкі.

У романе акрамя гэтага маюцца і другія сур'ёзныя політычныя зрывы.

За бальшавіцкую самакрытыку ў творчай дыскусіі

Клясавае змаганьне і соцыялістычнае будаўніцтва, вось тыя ўмовы, у якіх нараджаюцца і растуць новыя людзі, людзі соцыялістычнага грамадзтва. Александровіч пабудаваў свой роман ня ў гэтым пляне. Вырашэньне вялікага пытаньня ён хоча даць праз паказ "Яе" і «Яго», хоць і з пролетарскім паходжаньнем, і для гэтага ўціснуў гэтае вялікае пытаньне ў вузкія і старыя ўжо аблезлыя рамкі любоўна-бытавога роману. Гэта адна з прычын няўдачы роману. Але гэта не зьяўляецца галоўнай прычынай. Галоўнае ў павярхоўнасьці, у недастатковасьці сьветапогляду. Адсюль, менавіта, Александровічава боязьнь ісьці па лініі найбольшага супраціўленьня, па лініі глыбокага аналізу рэчаіснасьці; адсюль схэматызм і ў паказе людзей і ў паказе дзей; адсюль адсутнасьць глыбокага асмысьленьня матэрыялу і падзей і каўзаньне па іхняй паверхні. Адсюль, у выніку, невялікая і мастацкая і соцыяльная вартасьць твору. На гэтай падставе я не магу згадзіцца з т. Лыньковым, які «Нараджэньне чалавека» ставіць побач, нараўне з «Цені на сонцы» у сэнсе насычанасьці партыйнасьцю, насычанасьці клясавай ненавісьцю да ворагаў. «Нараджэньне чалавека» і ў гэтым сэнсе і мастацкі значна слабей «Ценяў».

У сваім новым творы, у п'есе «Напор», т. Александровіч значна адышоў ад мэтоду, якім зроблена «Нараджэньне чалавека». Але і п'еса не пазбаўлена павярхоўнасьці, схэматызму, адсутнасьці глыбокага паказу процэсаў, якія адбываюцца ў краіне.

Я гаварыў ужо, што творчасьць Александровіча займае ў беларускай пролетарскай літаратуры, і зусім законна займае, значнае месца. Ягоная творчасьць, гэта значная доля таго вялікага, агульнага актыву, з якім прыходзіць сёньня беларуская пролетарская літаратура да творчае дыскусіі.

Я думаю, што мае спрэчкі з т. Александровічам па пытаньнях творчага мэтоду зьяўляецца ў далейшым падставай для стварэньня творчых груповак і будуць карыснымі для далейшага росту абоіх нас, як пролетарскіх пісьменьнікаў. Думаю, што гэтыя спрэчкі будуць садзейнічаць далейшаму разгортваньню бальшавіцкае самакрытыкі ў нашай організацыі.

АД РЭДАКЦЫІ:

Да сутнасьці пытаньняў, закранутых у артыкулах таварыша Галавача і Чорнага, рэдакцыя вернецца ў бліжэйшых нумарох газэты.

КУЗЬМА ЧОРНЫ

Рэальная шматграннасьць і філёзофскае адзінства

(З „пісьменьніцкіх нататак“*)

... Уявім сабе кнігу мастацкае літаратуры на тэму аб пабудове электрастанцыі на тарпяным балоце. Як быццам мы маем справу з вытворчым жанрам. І гэта сапраўды так. Будзем ісьці ў гэтым пляне. Магутнасьць гэтай электрастанцыі прадбачыць вялікую лішніцу электраэнэргіі ў тым выпадку, калі прадпрыемствы—спажыўцы энэргіі не пабольшацца, паводле велічыні самое электрастанцыі. А калі пачаць з росту фабрыкі, дык гэты рост можа быць толькі тады, калі адначасна будзе рыхтавацца крыніца электраэнэргіі. Так што адна тэма цягне за сабою другую. Тут-жа вырастае і трэцяя тэма—сырэц. Уявім, што фабрыка тэкстыльная і пашырэньне фабрыкі патрабуе павялічэньня колькасьці ільну ёй. Значыцца, вырасла трэцяя тэма пра зямлю. Сам гэты плян прадбачыць гэтае ўзаемадзеяньне тэм, іх адзінства і роўнацэннасьць—індустрыяльны гігант, гарадзкая прамысловасьць, зямля (вёска, колектывізацыя). Мы знаходзімся ў сфэры аднаго пляну: перад намі адзнакі вытворчага жанру.

Паказаць толькі голае, і само па сабе, будаўніцтва індустрыяльнага гіганта, гэта значыцца яшчэ нічога не паказаць. Бо і электрастанцыя, і фабрыка, і ўсялякая машына ня ёсьць нейкая самамэта, рэч высокай тэхнічнай [illegible], што створана на тое, каб вечна захапляцца ёю і каб яна ўзвышалася над людзьмі, што яе стварылі. Машына цікавая толькі як сродак радкам пераходзім у сфэры іншых плянаў таго-ж самага творчага замыслу. Перад намі людзі.

Будаўніцтва электрастанцыі, або выкананьне промфінпляну на фабрыцы, або ўмацаваньне колгасу, мы ня можам паказаць без ударнікаў. А героі пяцігодкі, гэтыя энтузіясты соцыялістычнага будаўніцтва, ня ёсьць нейкія адмысловыя людзі, што ўзяліся ня ведама адкуль. **Гэтыя людзі ёсьць спадчыньнікі,** якія крытычна засвойваюць вялікае напластаваньне вякоў, яны ня з неба зваліліся. Хто, напрыклад, прыходзіць на пустое і дзікае балота будаваць электрастанцыю? Сярод усёй масы рабочых, мы тут знойдзем таксама масу тых-жа самых [illegible] сялян. Можа былых местачковых рамесьнікаў. Колектывізуючы сваю зямлю, сяляне спрэс і да самага карэньня зьмяняюць самы твар зямлі і ўсё жыцьцё на ёй. Яны прыходзяць на будаўніцтва, развітаўшыся назаўсёды з сваёю гэтакаю зямлёю, якую яны аралі спрадвеку і якая спрадвеку ляжала страшным цяжарам на іхных плячох.

Што пакінулі ўсе гэтыя людзі, прышоўшы на будаўніцтва, за сваімі плячыма? Яны прышлі разбураць старое і будаваць новае. А што гэта такое гэтае старое? У такой меры, як мы гаворым, што мала паказаць толькі адно голае будаўніцтва, у такой меры мы ня можам мець дачыненьня і да старога, паказваючы яго як якую-небудзь толькі вузкую палоску поля, пакорпанага дрэнным плугам, гнілую хату, або цьвілое сутарэньне рабочага. Трэба не забываць, што усе гэтыя бядоты, усялякая эксплёатацыя чалавека чалавекам, заўсёды вельмі ўдала ўгрунтоўваліся філёзофіяй эпохі, усяею ідэёваю накіраванасьцю каштоўнасьцяў культуры, створанай нявольніцкімі вякамі культуры, калі ўзяць яе ў цэлым, без асобных яе компанэнтаў, паганай. Але можа гэта ня так? Можа тыя «вечныя» ідэі, якія пролетарыят разбурае, ёсьць чыньнікі і сэнс чалавечага шчасьця? Можа, напрыклад, высокія цемрашалы—кіраўнікі якіх-бы там ня было рэлігійных плыняў, пачынаючы ад каталіцызма і канчаючы буддызмам, шчыра клапоцяцца пра шчасьце людзей прапаведваючы вечную праўдзівасьць ідэі бога? Мы маем прыклады, калі царква ў некаторых праслойках нават рабочае клясы—за межамі і нават яшчэ і цяпер—трымае свой уплыў. Дык вось, паказваючы новых людзей, будаўнікоў новага жыцьця, новай культуры, трэба паказаць і тыя процэсы, што адбываюцца ў іх і навокал іх, калі яны адпіхаюцца ад старых ідэй, ад старога сьвету і дзейна руйнуюць тое, што ў папярэднія вякі было як «вечнасьць», вечнасьць нявольніцкая і паганая. Маючы на ўвазе тут разбурэньне рэлігіі, мы такім парадкам уводзім твор у новы плян: у плян раскрыцьця існасьці рэлігіі. Твор перарастае свае вытворчыя рамкі і ўваходзіць у сфэру філёзофіі. Энтузіяст соцыялістычнага будаўніцтва ня толькі будаўнік соцыялізму, гэтай новай культуры, якая самым фактам свайго росту зьнішчае старую культуру, убіраючы ў сябе ўсё, што ў ёй ёсьць каштоўнага, ён і зьнішчальнік усіх павезаў нявольніцкае гісторыі. **Пры чым ён усё гэта зьнішчае і ў самым сабе. Ён здымае замкі з «вечнасьці».** І гэтыя замкі з «вечнасьці» павінна здымаць і літаратура.

Разам з тым, **як зьмяняецца ўсё** нават сама мясцовасьць, зьмяняюцца дачыненьні паміж асобнымі людзьмі, зьмяняюцца ў чалавеку густы і запатрабаваньні. Адбываюцца зьмены ў побыце, пераформаваньні ў сям'і. Такім парадкам твор уваходзіць у яшчэ адзін плян: плян сямейна-бытавы.

У нас вельмі часта і паказ герояў соцыялістычнага будаўніцтва і паказ будаўніцтва і росту гігантаў соцыялістычнае прамысловасьці робіцца ў мастацкіх творах ізолявана ад усіх гістарычных процэсаў, як штосьці гэтакае, што нейк раптоўна ўзьнікла, без гістарычнае падрыхтаванасьці. А гэта зьніжае каштоўнасьць твору. Калісьці і ў нас, у БССР, пачалі былі гаварыць пра гісторыю заводаў і пра гісторыю грамадзянскай вайны. Гэтую гісторыю, як і наогул гісторыю, мы павінны ведаць і заўсёды быць у яе сфэры, калі пішам свае творы. Гэтага патрабуе хоць-бы сабе момант выкрыцьця існасьці фэўдальнай і буржуазнай культуры, якую мы разбураем, будуючы культуру новую. Гісторыя заводаў, гэта ёсьць гісторыя пролетарыяту. А мы толькі тады здолеем напісаць поўнацэнныя творы, калі будзем ведаць гісторыю пролетарыяту. (Таксама і гісторыю буржуазіі). Нашы творы, значыцца, ўваходзяць яшчэ ў адзін плян: плян гістарычны. Павевы гісторыі павінны быць у літаратуры.

Клясавы вораг. Як ён змагаецца за свае ідэалы, як трымаецца за права на эксплёатацыю, і як у новыя формы пераходзіць клясавае змаганьне. Клясавае змаганьне, ненавісьць да клясавага ворагу і змаганьне з ім павінна прасякнуць увесь твор пісьменьніка.

Можа вельмі ўмоўна, я называю тут шматплянавасьцю гэтакую распрацоўку матэрыялу. Што, калі, напрыклад, твор напісаны на тэму аб пабудове электрастанцыі і гэтая пабудова паказана як гэроіка будаўнікоў, дык з гэтым цесна пераплецена ў творы і ёсьць яго неадменны компанэнт і зьмена мясцовасьці тут, і зьмена псыхікі і жыцьця тутэйшых людзей і таксама саміх будаўнікоў, і адміраньне рэлігіі, станаўленьне новае моралі, нараджэньне новых крыніц з якіх вырастаюць новыя масы будаўнікоў-энтузіястаў. Паказ усялякіх катэгорый і разуменьняў. Паказ зьмены самога жыцьця, замест ізоляванага паказу будаўніцтва. Аднак тэма аб пабудове электрастанцыі ставіць і распрацоўвае шмат проблем: дружба і варожасьць, замілаваньне і нянавісьць...

Разам з тым, як пралетарыят чуе за сваімі плячыма зьмрок мінулых вякоў, ён рыхтуе ясноты вякоў наступных. Гэтае шырокае пэрспэктыўнасьці мы павінны дамагацца і ад сваіх твораў.

У сьвятле ўсяго гэтага выразна вырысоўваецца вузкасьць такіх твораў як, напрыклад, мая «Вясна». Аднэй толькі тэматыкай адставаньне літаратуры ад эпохі ня зьнішчаецца. Колектывізацыя ня ёсьць толькі колектыўная апрацоўка зямлі і збор ураджаю. Колектывізацыя ўмешваецца і ў справы тое «вечнасьці», пра якую вышэй гаварылася. Або ўспамінаецца яшчэ апавяданьне (не маё) пра колгасьніка Трыхона Жаролу. Гэты чалавек з чорнай мінуўшчыны прынёс у колгас з сабою свае „праўды“ хрысьціянскае «смирение». Ён абураецца ўчынкам аднаго колгасьніка, які сказаў, што ў колгаснай сталоўцы абед дрэнны. Як? У колгаснай сталоўцы можа быць дрэнны абед? Гэта-ж «святотатство»! Новы чалавек пачнецца там, дзе скончыцца «смирение» і «славословие».

Адставаньне літаратуры ад задач соцыялістычнага будаўніцтва ў тым, што наша рэчаіснасьць расправілася з старою «вечнасьцю», што яна пазрывала заскарузлыя дзяругі ідэй, народжаных нявольніцкімі вякамі, што яна дала тып ударніка, тып бальшавіка, тып сучаснага новага чалавека. А наша літаратура часта яшчэ ўсё на гэтага новага чалавека нацягвае назад—то дзяругі романтызму, то мяшчанскага дабрабыту. А то гэтага шырокага і глыбокага сваім вырашэньнем вялікіх задач, сваёю дзейнасьцю, чалавека паказвае як чалавека вельмі вузкага.

Мы павінны дамагацца, каб кожная новая кніга, што выходзіць у сьвет, ішла ў арсэнал бальшавіцкае зброі. Літаратура накіроўвае, паказвае, вучыць. А няма лепшага настаўніка, як сама рэальнасьць. І от кожны літаратурны твор павінен быць гэтакім шматгранным, як сама рэальнасьць. Сіла літаратуры ў яе вялікай ідэёвасьці, у зямной яе рэальнасьці, у яе агні і напорнасьці.

Агнём і полымем замілаваньня і нянавісьці дыхаюць творы Віктара Гюго, на мяжы з навукай стаіць аналіз у творах Бальзака. Але не таму мы ўспамінаем гэтых клясыкаў, што нібы цераз іх мы раптам зразумелі патрэбнасьць нашай літаратуры агню («страстности» вобразаў і рэалізму) розуму, навукі. **Наша літаратура ня** будзе на вышыні нашае эпохі, калі ня будзе мець у сабе гэтых якасьцяў. І от, ідучы ад свае эпохі, ад свае літаратуры, ад сваіх задач, мы заўважаем на фоне старое культуры лепшых яе прадстаўнікоў, ні на хвіліну не забываючы таго (конкрэтна ў гэтым выпадку), што Віктар Гюго не разумеў сіл ходу гісторыі, што Бальзак ніяк ня вышаў з рамак свае (буржуазнае) клясы, якую ён так высьмейваў і крытыкаваў.

Шматграннасьць літаратуры прадбачыць многасьць спэцыфічных прыёмаў, кірункаў,—літаратурных груповак, якія разьвіваюцца ў межах адзінага творчага мэтаду марксызму-ленінізму. І калі мы будзем спрыяць разьмежаваньню літаратуры на гэтыя кірункі, дык мы гэтым самым будзем спрыяць роскіту нашае літаратуры...

*) Свае «пісьменьніцкія нататкі» пішу аднячасна з новымі творамі і на іх матэрыяле. К. Ч.

У асоцыяцыях пролетарскіх пісьменьнікаў

Рэйд брыгады БелАПП

Створаная, паводле пастановы сакратарыяту БелАПП, пісьменьніцкая брыгада па маршруту Сьвіслач-Крычаў складалася з чатырох т. т. Барашкі, Аксэльрода, Лужаніна і Мікуліча.

8-га лютага г. г. брыгада выехала з Менску ў м. Сьвіслач.

У Сьвіслачы 9-га лютага праведзен агульна-местачковы вечар у Нардоме. На вечары прысутнічала звыш 300 асоб, членаў профсаюзаў і колгасьнікаў. На вечары быў зроблен даклад пра задачы пролетарскай літаратуры, выступалі пісьменьнікі.

10-га быў наладжан у Сьвіслачы ранішнік для школьнікаў.

На ранішніку прысутнічала каля 400 дзяцей-вучняў старэйшых концэнтраў беларускай і яўрэйскай сямігодак. Увечары 10-га лютага была праведзена нарада з настаўнікамі і студэнтамі пэдкурсаў.

На вялікі жаль, дзякуючы адсутнасьці дапамогі ў рабоце брыгады з боку сьвіслацкіх організацый, 10-га ўвечары сарвалася выступленьне брыгады на гуце «Кастрычнік».

11-га лютага брыгада ў Магілеве. Увечары 11-га адбылося выступленьне брыгады ў Палітасьветкамбінаце для студэнцтва і настаўніцтва Магілеву. Быў зроблен даклад пра становішча сучаснай беларускай літаратуры і задачы БелАПП. Пасьля дакладу разгарнуліся спрэчкі. **Неабходна адзначыць выступленьне вялікадзяржаўнага шовініста Зэйгмана—настаўніка,** выкладчыка расійскай літаратуры. Усё яго выступленьне было накіравана на скомпромэтацыю БелАПП. БелАПП—гэта шовіністы,—гаварыў Зэйгман. Аўдыторыя дала рашучы адпор гэтаму выступленьню. Сакратар партколектыву тав. Масьлёнак, выступаючы, падкрэсьліў шкоднасьць выступленьня Зэйгмана, ацаніўшы выступленьне, як вылазку вялікадзяржаўнага шовініста.

12-га раніцой брыгада азнаёмілася з шаўковай фабрыкай.

13-га лютага брыгада выступала на заводзе «Чырвоны адраджэнец» у часе абедзенага перапынку. А 7 гадзіне ўвечары адбылося спатканьне брыгады з комсамольскім актывам Магілеву. Вечар адбыўся ў тэатры, пры перапоўненай аўдыторыі. На вечары была прынята рэзолюцыя пра разгортваньне пролетарскага літаратурнага руху ў Магілеве і задачы комсамолу.

У той-жа вечар адбыўся агульнагарадзкі літаратурны вечар. На вечары прысутнічала звыш 400 асоб. Не абходна адзначыць дрэнную падрыхтоўку да гэтага вечару з боку Гарпрофсавету. На вечары прысутнічала вельмі мала рабочых.

14-га раніцою адбыўся літаратурны ранішнік для школьнікаў Магілеву. На ранішніку прысутнічала каля 600 школьнікаў.

14-га а 4 гадзіне дню брыгада правяла сход студэнтаў літаратурна-лінгвістычнага аддзяленьня Магілеўскага Пэдінстытуту. На сходзе быў зроблен даклад пра становішча тэорэтычнага і літаратурнага фронту БССР.

14-га ўвечары адбылася нарада пры рэдакцыі газэты «Комунар Магілеўшчыны», што мела за мэту пакласьці пачатак Магілеўскай Асоцыяцыі Пролетарскіх пісьменьнікаў. На нарадзе абрана оргбюро на чале з рэдактарам газэты «Комунар Магілеўшчыны» тав. У. Пятровым.

Некалькі слоў пра становішча літаратурнай работы ў Магілеве.

Да выезду брыгады цэнтрам літаратурнага руху ў Магілеве зьяўляўся Пэдагагічны Інстытут. Пры Пэдінстытуце існаваў студэнцкі літаратурны гурток на чале з Гаўруком. Гурток быў абсолютна адарваны ад вытворчасьці. Ні белаппаўскага кіраўніцтва, ні практычнай белаппаўскай работы ў гуртку ня было.

Літаратурныя гурткі на прадпрыемствах у Магілеве не організаваны.

Бюро РК КП(б)Б, адзначыўшы, што прыезд брыгады БелАПП актывізаваў шырокія масы вакол пытаньняў пролетарскай літаратуры, вынес пастанову пра разгортваньне літаратурнай работы на прадпрыемствах, у комсамоле, з тым, каб пасьля організацыі на Шаўковай фабрыцы, на Швэйнай фабрыцы, на заводзе імя Сталіна літаратурных гурткоў—стварыць Асоцыяцыю Пролетарскіх Пісьменьнікаў. Бюро РК для кіраўніцтва літаратурнай работай вылучыла члена бюро РК рэдактара газэты «Комунар Магілеўшчыны» тав. Пятрова.

15-га лютага брыгада выехала ў Крычаў.

Брыгада выехала ў Крычаў ў такі час, калі на месцы глухога мястэчка вырастае новы горад, з асабліва вялікім будаўніцтвам цэмэнтнага заводу, фасфарытнага заводу, крэйдавага заводу, Сожбуду.

15-га ўвечары адбылося літаратурнае выступленьне для рабочых Сожбуду. На вечары прысутнічала 300 рабочых. **У выступленьні прадстаўнікі рабочых організацый прасілі БелАПП узяць культурнае шэфства над Сожбудам.**

16-га раніцою адбыўся ранішнік для школьнікаў. На ранішніку прысутнічала звыш 500 дзяцей.

16-га ўвечары адбыўся агульна-гарадзкі вечар для членаў профсаюзаў, для рабочых ільнозавода і колгасьнікаў Крычава. На вечары прысутнічала звыш 500 асоб.

16-га а II-й гадзіне ўвечары адбылася спатканьне брыгады з партактывам Крычаву.

17-га лютага раніцою брыгада азнаёмілася з будаўніцтвам цэмэнтнага заводу, з бытам рабочых, з работаю студэнтаў-практыкантаў, а ўвечары ў рабочым клюбе адбыўся ўрачысты сход рабочых, прысьвечаны прыезду брыгады.

Іл. Барашка.

У яўсэкцыі БелАПП

⊙ У сакавіку месяцы амэрыканская комуністычная газэта на яўрэйскай мове (штодзенная) «Морген Фрайгайт» сьвяткуе свой дзесяцігадовы юбілей існаваньня. Яўсэкцыя БелАПП рыхтуецца да гэтага юбілею. Яўрэйскія пролетарскія пісьменьнікі зьбіраюць літаратурны матэрыял для юбілейнага нумару «Морген Фрайгайт». Юбілей брацкай комуністычнай газэты будзе адзначаны масавымі сходамі, дакладамі і інш.



У Менск прыехаў яўрэйскі пролетарскі пісьменьнік Аргэнтыны тав. Блоштэйн.

⊙ У сувязі з тым, што яўрэйскі дзяржаўны тэатр пасьля доўгага перапынку пачаў працаваць у Менску—яўсэкцыя БелАПП стала на шлях актыўнай дапамогі тэатру. На агульным сходзе яўсэкцыі т. Рафальскі і Аронес прачыталі сваю новую п'есу (літмонтаж) «У змаганьні». Яўсэкцыяй вылачана спэцыяльная пісьменьніцкая брыгада, якая мае на мэце дапамагчы апрацаваць п'есу. 25 лютага яўсэкцыя БелАПП сумесна з колектывам тэатру абгаварылі апошнюю па станоўку «Штурм».

Пасьля дакладу рэжысэра пастаноўкі т. Норда, разгарнуліся спрэчкі, у якіх удзельнічалі т. Бронштэйн, Харык, Швэдзік і інш. Пры тэатры організуецца сталая драматургічная група з сіл яўсэкцыі БелАПП і акторскага колектыву.

⊙ У бліжэйшыя дні яўсэкцыя БелАПП разам з літкамісіяй яўсэктара БАН організуе вечар, прысьвечаны абгаварэньню крытычных артыкулаў т. Дунца «Ін шлахтэн» («У баях»). З дакладам пра кніжку т. Дунца выступіць т. Валабрынскі.

⊙ Яўрэйскі пролетарскі пісьменьнік т. М. Альбэртон наведаў Менск. Тав. Альбэртон член ВУСПП'а, адзін з выдатнейшых яўрэйскіх пролетарскіх прозаікаў, вядомы сваімі творамі «Біробіджан» і «Шахты»; яго творы пераведзены на расійскую, украінскую, нямецкую і іншыя мовы. Цяпер т. Альбэртон працуе над гісторыяй мэталюргічнага заводу імя Пятроўскага.



Тав. Альбэртон.

Тав. Альбэртон заключыў умову з Белдзяржвыдавецтвам на выданьне сваёй кніжкі на беларускай мове. Яўсэкцыя БелАПП організавала шэраг літаратурных вечароў, прысьвечаных творчасьці т. Альбэртона. Альбэртон выступіў на агульным сходзе яўсэкцыі БелАПП і яўрэйскіх літгурткоў Менску з дакладам пра яго творчы мэтод.

Мяшчанскае аплёўваньне соцыялістычнага будаўніцтва

Нядаўна вышла з друку кніжка эскізаў Аркадзя Лясного «Вялікае нараджэньне». Паглядзеўшы на загаловак, можна падумаць, што пад гэтым загалоўкам А. Лясны будзе апавядаць пра сапраўднае нараджэньне пролетарскай рэволюцыяй, новага жыцьця, пра нараджэньне соцыялістычнай экономікі, пра нараджэньне вялікай культуры чалавецтва, пра нараджэньне новых фабрык, заводаў, новага гораду, новай колгаснай вёскі, новага чалавека, які зьяўляецца вынікам гэтага нараджэньня і разам з тым будаўніком яго. Але кніжка апавядае пра іншае. Кніжка падае ня тое, што мог чакаць чытач.

Той матэрыял, тыя факты жыцьця, вобразы рэчаіснасьці, якія занесены аўтарам на старонкі гэтай кніжкі, кажуць пра тое, што да іх меў дачыненьне пошлы абыватаь.

Трэба сказаць, што ў кніжцы гаворыцца пра некалькі буйных беларускіх гарадоў (Барысаў, Воршу, Магілеў), пра соцыялістычныя фабрыкі і заводы.

Але як гэтыя гарады, соцыялістычная прамысловасьць аўтарам паказваюцца?

Гэтыя гарады, іх прамысловасьць падаюцца праз пошлыя, мяшчанскія, гнілыя абразкі, праз мяшчанскае абмежаванае «я».

Аўтар увесь час заняты клопатамі свайго «я». Ён сваё «я» ставіць вышэй рэчаіснасьці, вышэй тых об'ектаў, да якіх ён мае дачыненьне, з якімі так ці інакш сустракаецца.

З самага пачатку кнігі гэтае «я» паўстае перад чытачом: «Рамізьнік паволыю вязе мяне са станцыі ў горад». «Я забыўся, што тут ўсяго крыху больш гадзіны ад Менску, і адчуваў сябе так, як адчуваеш дзе-небудзь у ваколіцы вялікага прамысловага гораду» (?). «Я пераступіў парог некалькіх мінулых стагодзьдзяў». «Я ляжу на ложку ў гасьцініцы і перачытваю ў «Нашым Краі» артыкул мясцовых краязнаўцаў пра горад, барысаўскія заводы і раён». Перад маімі стомленымі нагамі ізноў пяскі барысаўскай «Сахары». «Я сеў на аўтобус ехаць у Нова-Барысаў».

Далей у гэтай кніжцы цэлы шэраг малюнкаў, як Аркадзю Лясному цяжка было знайсьці месца ў горадзе пераначаваць, як ён начаваў у доме селяніна і «атрымаў некалькі няпрыгожых жывёлінак шэрага колеру», як «назаўтра яны ўсе згінулі ў часе майго купаньня (гэта значыць, Аркадзя Лясного—С. К.) у хвалях Бярозы ў Бабруйску. Малюнкі, як аўтар вандраваў па заводах і як пасьля вандраваньня «сьпяшаўся на плыты Бярозы выкупацца» (?).

Гарады, прамысловыя цэнтры БССР (Барысаў, Ворша, Магілеў) аўтарам абмалёўваюцца самымі чорнымі фарбамі. Аўтар зусім не падкрэсьлівае таго вялізарнага росту ранейшых провінцыяльных гарадоў, соцыялістычнай прамысловасьці ў гэтых гарадох, росту пролетарыяту, росту пролетарскай культуры, што ёсьць пасьля рэволюцыі. Лясны гэта затушоўвае падобнымі малюнкамі: «Ня дзівецеся, калі вы ўбачыце, як перад самым носам аўтобуса філёзофскі павольнай хадой пераступае вуліцу рабая сьвіньня... Ня дзівецеся, калі вы сустрэнеце на вуліцы сялянскага хлопца ў лапцёх і страшэнна падраных і пералатаных галіфэ, і ён з блакітным сумам у вачох запытаецца ў вас: «Дзе біржа працы?».

Нашы дасягненьні ў соцыялістычным будаўніцтве, наш шпаркі рост аўтар бачыць толькі ў пратаколах, якія перадае праз мяшчанскі пошлы лірычны сарказм:

«І колькі нязломнай энэргіі, колькі сілы колектыўнай волі трымціць ў гэтых, здаецца, звычайных і простых лічбах пратаколаў, у гэтым шматку газэтнай паперы з дагаворам аб соцыялістычным спаборніцтве ў гэтых нямногіх словах». Так Лясны паказвае гэроіку нашага будаўніцтва.

Замест паказу конкрэтнага будаўніцтва—голыя лічбы, протаколы. Замест паказу рабочага, ударніка вытворчасьці—плаксівы, абарваны сялянскі хлапчук шукае працы. Замест паказу росту пролетарскай культуры ў прамысловых цэнтрах БССР—брудны дом селяніна, неахайныя вуліцы, па якіх спацыруюць «філёзофскія» сьвіньні. Замест паказу кіраўніцтва комуністычнай партыі вялікім будаўніцтвам—выпіраецца надутае, пошлае, мяшчанскае «я».

Бязумоўна, кніжка эскізаў А. Лясного «Вялікае нараджэньне» зьяўляецца мяшчанскім аплёўваньнем соцыялістычнага будаўніцтва, аплёўваньнем новага гораду, мяшчанскім аплёўваньнем ідэй будаўніцтва, лініі комуністычнай партыі.

Акрамя гэтага ў гэтай кнізе своеасаблівым спосабам працягваецца ідэйка вялікадзяржаўнага шовінізму. А. Лясны, падаючы малюнкі работы рабочага клюбу, работы па правядзеньні беларусізацыі сярод рабочай масы,—падае гэта так, што беларусізацыя навязваецца зьверху, што пра беларускую мову рабочыя ня хочуць і слухаць, як наогул ня хочуць слухаць пра культурную рэволюцыю.

Вось, як падае падобныя малюнкі Лясны:

«Маладая жанчына ў мужчынскай кашулі з рашпіленым каўняром і падняразанай беларускім поясам рабіла даклад. Моцным і рашучым голасам яна проста і ясна тлумачыла значэньне культурнай рэволюцыі ў рэконструкцыйны пэрыод, яна заклікала ўсю залю ўзяцца за ліквідацыю сваёй няпісьменнасьці і культурнай адсталасьці».

Як-жа слухалі гэтую жанчыну?

«Публіка ў асноўнай масе сваёй ня менш рашуча не хацела яе слухаць. Здавалася, нібы прызыдыум і заля падзелены нейкім нябачным кітайскім мурам і тое, што робіцца на сцэне, ня мае ніякага дачыненьня да гэтых людзей, што сядзяць тут у залі».

Вось якая сувязь, паводле Лясного, паміж кіраўніцтвам і рабочай масай. Вось соцыяльны зьмест кніжкі «Вялікае нараджэньне».

Кніжка «Вялікае нараджэньне» зьяўляецца шкоднай кніжкай. У адносінах да выданьня гэтай кніжкі ДзВБ праявіла самы сапраўднейшы гнілы лібэралізм.

С. Куніцкі.

Друкарня імя Сталіна, Менск

СЯРГЕЙ ДАРОЖНЫ

Пародыя на поэму „Рахіль“ В. Казлоўскага

Мне часта марыцца,
Мне часта, часта сьніцца,
Калі я йшоў з расхістанай душой
Сустрэць прыгожую такую
У спадніцы
Рахіль, краўчыху з-пад ўзьдзенскіх
сёл,
І вам таксама марыцца напэўне
Калі яна стаяла ля сяней,
І як дазналася ўся дзяржаўня,
Што любіць палкая Рахіль мяне.
Мой бацька ведаеце, саматужнік,
У каханьні ён ні бэ ні мэ...
Ён кожны дзень выкідваў, сволач,
ружы,
Што прысылаліся патайна мне.
Спрыважан я душою маладою.
Адвечная бяссоньніца ў зачох—
Цяпер ня прыдзецца страчацца з ёю
За мною бацька з кіем ходзіць
Па начох.
О гора мне,
А гора не пазабыцца!
А месяц плыў,
А месяц плыў у муць.
Тады я думаў з гора ўтапіцца
І назаўсёды патануць.
О, ветры, ветры
Дайце мне настрою
Дажджы, дажджы заткнецеся на час.
Я леру зломанай душы настрою
На жудасна-трагічны час.
Пагром...
Нажы...
паломаныя зубы...
Наўкол зьвяр'ё
Зубамі ляскаціць.
Рахіль ля шыбеніц чакае згубы
І нельга мне яго аслабаціць.
О, ведай сьвет!
Якая гэта мука.
Душа мая крычала парасём..:
Я ў тыя дні трагічнае разлукі
І плакаў і сьмяяўся і ўсё...
Я падружыў-бы з злодзеем і
шэльмай
І камень зубам вострым раскусіў,
Каб толькі вызваліць
Маю Рашэлю,
Але дарма—яна вісіць!..
(Трагічны бас):
Замоўклі струны
Маёй гітары
Сьціскаюць пальцы разьбіты грыф.
Паўстане грозны пролетары,
Зямлю сагрэе
Агнём зары.
Ідуць за палкамі палкі
Тупаціць коньніца,
Гэта—бальшавікі
За белымі гоняцца..:
Хто там?
Хто там?
Хто там?
Куды ідзе і адкуль?
Кулі сыплюцца шротам
Можа тысячы куль.
Гэй барабан барабань (Маякоўскі)
Трывогу трубі труба (Безыменскі)
Раз, два, тры (Казлоўскі).
Раз, два, плі. (Таксама).
Узьняўся агонь атак
Тру-ру-ру, тра-та-та..:
Буухх—бахх...
Ухх—Аахх.
Плі, калі
Рэжж, даві...
Дзын-дззз..:
Фій, фэ...
Цік-Цок.
І буржуй уцёк.
А з лесу насустрач Абрам
— Хто вы такія?



Стой!
Я—цар.
Я—уладар.
І ні якіх гвалдоў!
За што Рахіль загналі ў зямлю?
О, дайце мне атруты,
Я памру...
Я гэтага Казлоўскага заб'ю
За гвалты і за гэтакую пру...
А ў гэты час
Як з неба насустрэчу
Вярхом упрунь
Бяз лейцаў і стрымён
Імчыцца нейкі чалавечак,
А за плячыма кулямёт.
— Рахіль? Адкуль?
Дык ты жывая?
Ня веру я, пакаж мандат,
А можа зданьне, ты ня тая...
І я табе—ні сват ні брат.
Нашто-ж маніць, Рахіль,
Прызнайся?
Твой тата ўсю зямлю абег...
І тут сустрэча адбылася
Па судзьбе..
А недзе там
Плывуць чайны з-за хмараў
І ўсе раз'ехаліся хто куды...
І толькі я з разьбітаю гітарай
Стаю над лужынай лірычнае вады.

На творчай дыскусіі ў МенАПП

22-га лютага ў Доме Пісьменьніка адбыўся працяг спрэчак па дакладу тав. Лынькова «Ліст тав. Сталіна і задачы беларускай пролетарскай літаратуры». У спрэчках выступалі т. т. Бэндэ, Ліманоўскі, Ц. Гартны, Аляхновіч, Мікуліч, Куніцкі, Вярнікоўскі і інш.

Усе выступленьні галоўным чынам былі сконцэнтраваны навокал задач, якія стаяць перад літаратурай, у сувязі з лістом т. Сталіна.

Усе т. т. асаблівую ўвагу ўдзялялі пытаньню стварэньня вобразу бальшавіка ў мастацкай літаратуры, пытаньню змаганьня за партыйнасьць, за магнітабуды літаратуры, пытаньню змаганьня за комсамольскую тэматыку ў пролетарскай літаратуры, спыняліся на ролі і задачах агляду маладзёжнай літаратуры.

Спрэчкі адбываліся па конкрэтных творах паасобных пісьменьнікаў, вызначаючы рост і недахопы іх творчасьці.

Асаблівую ўвагу заслугоўвае выступленьне ў спрэчках тав. Бэндэ, які шырока спыніўся на тых задачах, якія стаяць перад пролетарскай літаратурай у сувязі з узрастаючай пагрозай вайны. Пасьля выступленьня тав. Бэндэ актыў пісьменьнікаў прыняў пастанову пра выданьне двухтомніка твораў пролетарскіх і савецкіх пісьменьнікаў, якія адлюстроўваюць гэроічнае змаганьне і рост Чырвонай арміі.

У сваім заключным слове тав. Лыньков адзначыў сур'ёзны зьмест спрэчак, а таксама неабходнасьць яшчэ большай актывізацыі фронту пролетарскай літаратуры ў напрамку аўладаньня тэорыяй марксызму-ленінізму, мэтадам дыялектычнага матэрыялізму, яшчэ большай клясавай пільнасьці да клясавага ворага.

У заключным слове тав. Лынькоў падкрэсьліў неабходнасьць уключыцца ўсяму актыву МенАПП і БелАПП у правядзеньне агляду мастацкай літаратуры, а таксама завастрыў увагу на стварэньні зайсковай тэматыкі.

Апошнія два вечары дыскусіі яскрава паказваюць палітычна-творчы рост МенАПП і БелАПП. Разам з гэтым трэба адзначыць недапушчальным зьявішчам тое, што некаторыя т. т. менапаўцы ня лічаць патрэбным прысутнічаць на дыскусіі і гэтым самым недаацэньваюць палітычнае і творчае значэньне апошняй.


Наперадзе—творчыя вечары пра конкрэтныя творы, пра паасобных пісьменьнікаў. Менапаўцы, рабочыя літгуртоўцы павінны прыняць самы актыўны ўдзел у гэтых творчых вечарох дыскусіі.

С. К.

Сьцяпан Ліхадзіеўскі— „Крывавыя зьнічкі на сьнезе“

поэзія, ДзВБ,с тар. 55, цана 75 кап.

У зборнік «Крывыя зьнічкі на сьнезе» тав. Ліхадзіеўскі аб'яднаў вершы, якія ў агульным злучэньні паказваюць жыцьцё, працу, спаборніцтва, ударніцтва ў колгасе.



Актуальнасьць тэматыкі, якая пакладзена ў аснову зборніка, значна тым, што аўтар у вершах паказвае рост соцыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі. Праўда, аналіз колгаснай рэчаіснасьці, які робіць малады поэт, не пазбаўлены недахопаў (залішні схэматызм, спрошчанасьць).

Ліхадзіеўскі ў мастацкіх вобразах гаворыць пра тое, што колгас нараджаецца не мэханічна, а ў полымі клясавых боек.

У поэме «Чырвоныя зьнічкі на сьнезе» аўтар зборніка паказвае, як супроціўленьне клясавага ворага ў выніку нашага наступу даходзіць да азьвярэласьці. Клясавы вораг імкнецца вырваць лепшых сыноў колгасу. Але:

Кроку бяз бою ня здаць!
Сьмела ў агонь барацьбы!

Толькі ў непаслабнай барацьбе з ворагам «нашы гоні пышна маладзеюць». Ліхадзіеўскі ўпэўнены ў перамове соцыялістычнага наступу:

Пройдзем віхры
ўпартай барацьбы,
перамога—
ведаю, за намі.

Аднак, гаворачы пра перамогу ў колгасным будаўніцтве, Ліхадзіеўскі ня робіць паказу формаваньня пачуцьцяў, думак новага чалавека ў працы на колгасных палёх. У вершы «Ці ня з гэтага тая ружа»... поэт гаворыць пра тое, што ў колгасе, калі «буйны колас нахіліўся да зямлі, нас тады аддаиай справе восем,—тэмпы ўдарныя ўзялі, а далей ідзе рад агульных рыторычных фраз пра колгасную працу. Паказ ўдаиірцтва і ўдарнікаў пачынаецца і канчаецца парай фраз. Ударнік застаецца не паказаным у рэволюцыйнай практыцы. Акрамя таго, у поэта яшчэ ў наяўнасьці груз старых дробнабуржуазных адносін да новай колектыўнай працы.

Зазначаючы, што ў процэсе працы «песьню новую шукае колгасьца», аўтар зборніка не дае гэтых песен аб працы.

Таварыш Ліхадзіеўскі павінен рашуча перамагаць недахопы сваё творчасьці, найбольш поўна разгарнуць паказ думак, пачуцьцяў і настрояў, якія формуюцца ў людзей на колгасных палёх, у клясавай практыцы. Трэба пазбавіцца, элемэнтаў схэматызму, элемэнтаў няўважлівых нядбайных адносін да поэтычнай творчасьці.

П. Бухароў.

Па тэхнічных прычынах
—) ГАЗЭТА (—
„ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА“
З НАСТУПНАГА НУМАРУ
будзе выходзіць 8, 18, 28

Супроць літфронтаўскіх памылак

(„Контратака“ па Е. Паўлаву ў рабочым тэатры ЦСПСБ)

Вялікай культурнай адзінкай, якая сьведчыць пра дасягненьні пролетарыяту БССР на фронце культурнага будаўніцтва, зьяўляецца Рабочы тэатр ЦСПСБ.

Характарная адзнака гэтага тэатру ў тым, што акторскі склад—у пераважнай большасьці рабочыя, якія прыйшлі на сцэну з прадпрыемства, ад варштатаў. Тэатр працуе два гады, улічваючы сюды і студыйны стаж работы.

Да апошняга часу мы ведаем «Стрэл», «Чынгільбуд» і «Вецер з мора» ў пастаноўках гэтага тэатру. Усю сваю работу тэатр праводзіў у рабочых клюбах Менску і інш. рабочых цэнтраў.

Трэба адзначыць, што патрэбнай увагі з боку пролетарскай грамадзкасьці і працаўнікоў культурнага фронту да тэатру ня было. Дзякуючы гэтаму работа ў тэатры праходзіла без дастатковага рабочага контролю.

Чым інакш растлумачыць, як ня гэтым, выбар тэатрам п'есы Е. Паўлава «Контратака» для вялікага паказу?

Тэма «Контратакі» — актуальная—змаганьне нямецкіх рабочых з буржуазіяй за савецкую Нямеччыну. Але аўтар гэтую тэму вырашыў літфронтаўскім парадкам. Замест глыбокага паказу клясавага змаганьня, замест глыбокага паказу ворагаў пролетарыяту —буржуазіі, здраднікаў пролетарскае рэволюцыі—соцыял-дэмократы, у адзіным сюжэтным цэлым аўтар фотографічна, у выглядзе хронікі, не перарасшай у мастацкія вобразы падаў па асобныя моманты клясавага змаганьня нямецкіх рабочых. Здавалася, ня трэба было тэатру браць гэтую п'есу для паказу. Нельга апраўдаць факт выбару п'есы «Контратака» адсутнасьцю п'ес на інтэрнацыянальныя тэмы, якія хвалююць нашага гледача, на якіх мы павінны выхоўваць масавага пролетарскага гледача.

Здарылася інакш. Тэатр прыняў гэтую п'есу і ў пастаноўцы рэжысэра В. Галаўчынера 25-га лютага адбыўся першы паказ яе на вялікай сцэне.

Трэба адзначыць, што рэжысэр ня здолеў перамагчы літфронтаўства, закладзенага ў п'есе, і пайшоўшы па лініі найменшага супраціўленьня, ня правільна падаў паасобныя вобразы, прыкладам: фабрыкант Вільзэ, малады юнгфронтавец Грэнэр (выразная постаць, вобраз якога мог-бы быць раскрыты да канца, застаецца скамечаным, ня выразным), дэпутат ландтагу с.-д. Ланц (выглядае недарэчным папугаем, а не соцыял-здраднікам).

Літфронтаўшчына праяўляецца ў афармленьні масавых сцэн, дзе маса абязьлічана, дзейнічае пад адзін рух, гаворыць пад адзін голас і г. д.

Пры ўсіх недахопах дадзенага матэрыялу можна было ў пастаноўцы п'есу зрабіць больш пэўнаю і даходлівай да гледача.

Мастак Дзясьніцкі пры ўсёй выгаднасьці конструкцыі для вандроўнага тэатру зрабіў дэкорацыі аднастайнымі і ня зусім адпаведнымі для розных тэм супроцьлеглых па замыслу.

П'еса патрабуе пераапрацоўкі ў кірунку максымальнага актывізаваньня мас на змаганьне з клясавым ворагам, бо паліцыя і вайскоўшчына пададзена ў марыянэтачным выглядзе, не паказана, дзякуючы ўтрыроўцы, як сур'ёзныя ворагі пролетарыяту.

Няўпрыклад нашым іншым тэатрам акторскі колектыў паказаў сур'ёзныя адносіны да аўладаньня беларускай літаратурнай мовай.

Пастаноўка гэтай п'есы павінна паслужыць пачаткам разгортваньня дыскусіі пра творчы мэтод у нашых тэатрах. Рабочы тэатр ЦСПСБ замест таго, каб унікнуць памылак, дапушчаных у БДТ-1 пастаноўкай «Справа гонару», пайшоў па лініі не выпраўленьня, а паглыбленьня іх.

Неабходна мабілізацыя ўвагі пролетарскай грамадзкасьці вакол Рабочага Тэатру ЦСПСБ. Здольны колектыў тэатру, заклікаНы партыяй ствараць пролетарскае мастацтва, у праве патрабаваць да сябе большай увагі.

Б. Л.

В. П. Палонскі

24 лютага а пятай гадзіне ўвечары ў Магнітагорску памёр Вячэслаў Палонскі.



Тав. Палонскі прыбыў у Магнітагорск 22 лютага а 1 гадзіне ўначы, захварэўшы па дарозе. З цягніка т. Палонскі быў зьняты непрытомным і пераведзен у больніцу. Консыліум вызначыў дыягназам сыпны тыфус пры абсолютнай арытміі сардэчнай дзейнасьці. Тэмпэратура, што ўзьнімалася вышэй 39, пасьля апрытомненьня трымалася ў выніку слабой сардэчнай дзейнасьці на ўзроўні 36.

Вячэслаў Паўлавіч Палонскі нарадзіўся ў 1886 г. у сям'і майстра гадзіньнікаў, вучыўся ў Пецярбурскім псыхонэўролёгічным інстытуце, адкуль быў выключаны за кіраўніцтва студэнцкай забастоўкай і сасланы на два гады ў Алянецкую губэрню. Па звароце чытаў лекцыі па літаратуры. З лютаўскай рэволюцыі—член групы с.-д. інтэрнацыяналістаў. З 1919 г.—член УсеКП(б).

Пасьля Кастрычніцкай рэволюцыі т. Палонскі працаваў у Рэўваенсавеце (быў старшынёй Вышэйшага вайсковага рэдакцыйнага савету), потым працаваў у часопісях. В. П. Палонскі быў заснавальнікам і рэдактарам часопісі «Печать и революция». Рэдагаваў на працягу шэрагу гадоў (да сьнежня 1931 г.) часопіс «Новый мир». Тав. Палонскі быў рэдактарам аддзелу літаратуры і мастацтва «Большой советской энциклопедии» з І па XVII том уключна (1925—1930 г.) у апошні час т. Палонскі быў дырэктарам «Музея изобразительных искусств» у Маскве. Тав. Палонскі быў членам ВССП і прымаў актыўны ўдзел у шэрагу грамадзка-літаратурных і творчых выступленьняў саюзу (дыскусія ў верасьні 1931 г.) і г. д.

У артыкуле, прысьвечаным памяці В. Палонскага, «Известия» (27 лютага) пішуць:

«Па сваёй натуры ён быў не пролетарскім, а інтэлігенцкім рэволюцыянэрам, але рэволюцыянэрам, які правільна і ўпарта хацеў працаваць у шэрагах пролетарскай партыі. Палонскага шмат і жорстка крытыкавалі за яго памылкі, але ён упарта вучыўся і працаваў над сабой. Ён быў поўны сіл і энэргіі, і няма ніякага сумненьня, што змаганьне пролетарыяту і новае соцыялістычнае жыцьцё, якое ён будуе, пераапрацавалі-б старую закваску Палонскага і зрабілі-б з яго буйнога таленавітага працаўніка».

(«Л. Г.»).

Адказны радактар Х. ДУНЕЦ

Выдае Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі

Галоўлітбел № 295